Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 102 (27960) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




## Адновім Будслаўскі касцёл разам!

СТАР. 4



## Пейзаж 2×120 метраў

СТАР. 9

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



## Пад аховай святога Мікалая

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У краіне створаны ўсе ўмовы, каб рэалізавацца маладым. Вартыя творчыя праекты не застаюцца без увагі, уручэнне ўзнагарод і прэмій найлепшым — гэта добры стымул для далейшага развіцця маладых талентаў. Званне стыпендыята спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі — магутны імпульс для таго, каб развіваць свае здольнасці, рэалізоўвацца ў творчасці. Усё гэта ідзе на карысць дзяржаве, спрые яе развіццю. За гады існавання фонду каля 6 тысяч маладых людзей сталі стыпендыятамі. Шэсць мільярдаў рублёў выдзелена на фінансаванне расходаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі ў 2015 годзе з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду кіраўніка дзяржавы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14815,00 | ▼ |
| Еўра | 16154,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 278,75 | ▼ |
| Укр. грыўня | 701,65 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

У аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна ў першы дзень лета адкрыўся дзіцячы дом сямейнага тыпу. Уваходзіны святкавала вялікая сям'я Барыса і Святланы Міцкевічаў, якія выхоўваюць сямёра прыёмных і дваіх сваіх дзяцей. Яны сталі ўладальнікамі новага прасторнага двухпавярховага катэджа па вуліцы Копыскай, з вокнаў другога паверха якога адкрываецца цудоўны від на Днепр.



# Дом, дзе паселіцца мара

«Сям'я Міцкевічаў за гады прафесійнага бацькоўства (з 2003 года) зарэкамендавала сябе з найлепшага боку, — адзначыў на ўрачыстай цырымоніі **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Назіраючы з боку, не скажаш, што гэта іх праца, — яны ўсё робяць па загадзе сваёй душы. Таму ў іх доме пануе ўтульнасць, а дзеці акружаны клопатам і ласкай. Такім бацькам дзяржава павінна дапамагаць, каб выхаваўчы працэс праходзіў у максімальна камфортных умовах. Цяпер іх мара здзейснілася».

Намеснік старшыні аблвыканкама ўручыў шматдзетнай сям'і ў якасці падарунка сертыфікат на 25 млн рублёў для набыцця мэблі.

Дарэчы, усяго ў Шклоўскім раёне функцыянуюць 4 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, у якіх выхоўваюцца 30 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.



Фота БЕЛТА.

■ На свае вочы

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ЦІНЯВІЧ

## Як энтузіясты з Мінска вёску адрадзілі

**У вёску Цінявічы Карэліцкага раёна, якая яшчэ 5 гадоў таму лічылася не проста неперспектыўнай, а ўвогуле страчанай для гэтых мясцін, нядаўна з'ехаліся людзі не толькі з навакольных мясцін, але і з Мінска, іншых рэгіёнаў Беларусі. Гаспадары сялянскай гаспадаркі «Белыя лугі» арганізавалі для іх фестываль «Талака» — з народнай музыкай, танцамі, кірмашом рамеснікаў, гульнямі і забавамі, з дранікамі і іншымі стравамі нашай нацыянальнай кухні. А асобнай «фішкай» свята стала сяўба пшаніцы паводле беларускага абраду, дзе спачатку выбіралі так званую «лёгкую руку».** СТАР. 5



Іван РАДЗЮКЕВІЧ разам з удзельнікамі прэс-тура за сяўбой лубіну.

**«Прамая лінія»**

## ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ У ПОБЫЦЕ

Бадай, кожны з нас марыць пра цёплы і ўтульны дом. Яшчэ лепей, калі ён не патрабуе вялікіх выдаткаў на ўтрыманне. Дасягнуць гэтага можна дзякуючы энергазберажэнню. Галоўнае — рабіць усё з розумам. Ці насамрэч энергазберагальныя лямпачкі даюць значную эканомію электрычнасці? Класы энергаэфектыўнасці бытавой тэхнікі — рэкламны ход ці рэальная выгада? Як не аплачваць залішняе ацяпленне? На гэтыя і іншыя пытанні **3 чэрвеня з 11.00 да 12.00** падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі газеты «Звязда» адкажа **намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей Аляксандравіч СЯМАШКА.**

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: **8 (017) 287 18 71.** Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі (**info@zvyazda.minsk.by**) або задавайце па тэлефонах: **8 (017) 292 38 02** ці **8 (017) 287 17 51.**


ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# СІТУАЦЫЯ — КІРАВАНАЯ І СПАКОЙНАЯ

## На ўнутраным валютным рынку і з цэнамі

**Пра гэта далажыў Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнта цікавіла бягучая сітуацыя ў эканоміцы, у якой намеціліся пазітыўныя тэндэнцыі. «Калі раней мы выкідвалі валюту, «палілі» золатавалютныя рэзервы, то сёння папаўняем іх. Юрыдычныя і фізічныя асобы прадаюць валюту. Гэта працэс добры», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што манетарная, валютная палітыка павінна забяспечваць развіццё эканомікі. «Але гэта не значыць, што мы павінны адысці ад жорсткай палітыкі», — сказаў Прэзідэнт. Крэдытавацца павінны такія праекты, каб выробленая прадукцыя магла быць гарантавана рэалізаванай. «Калі гэтага няма — грошай няма», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прадпрыемствы, у якіх заключаны кантракты, змогуць узяць крэдыты нават пад абаротныя сродкі, хоць і на невялікі тэрмін. «Тут выдумляць нічога не трэба. Мы ад гэтага адыходзіць не павінны», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што папярэджваў ужо ўрад, кіраўнікоў аб тым, што часу на разварушванне няма. «Нават, я сказаў бы, не на разварушванне, а на тое, каб «зарадзіць» і потым «выстраліць» у канцы жніўня — пачатку верасня. Засталося ўсяго два месяцы. Мы не можам людзей пакінуць без работы. У адваротным выпадку людзям і дзяржава такая не патрэбна», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што з-за абвалу расійскіх рынкаў, санкцый, эмбарга, беларуская эканоміка страціла амаль $3 млрд. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Расія аказвае Беларусі сістэматычную падтрымку, бакі дамовіліся сумесна шукаць выйсце з цяперашняй сітуацыі. Прэм'ер-міністр далажыў, як ідзе работа ў гэтым напрамку.

Акрамя таго, Андрэй Кабякоў праінфармаваў Прэзідэнта аб ходзе нарыхтоўкі кармоў. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб урад і профільнае міністэрства надалі гэтаму пытанню асаблівую ўвагу, каб сёлетні ўраджай кармоў быў нарыхтаваны ў поўным аб'ёме. Прэзідэнт дадаў, што ў найбліжэйшы час асабіста праінспектуе ход кормаўборачнай кампаніі.

Прэм'ер-міністр падчас даклада нагадаў, што ў снежні мінулага года былі рэалізаваны вымушана строгія меры, якія далі магчымасць адаптаваць эканоміку да існавання ў новых умовах. Прадугледжаныя прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця цана на нафту і курс расійскага рубля да долара прыкметна адрозніваліся ад фактычных паказчыкаў у I квартале. Прынятыя захады не маглі не паўплываць на валавыя паказчыкі эканомікі, перш за ўсё на ВУП, але яны далі свой вынік, забяспечыўшы спакойную, кіраваную, прадказальную сітуацыю на ўнутраным валютным рынку і з цэнамі.

# ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА

## Індыя — велізарны рынак і эканамічны гігант — хацела б бачыць хуткае і значнае ўмацаванне сувязяў з нашай краінай



**Беларусь з'яўляецца важным міжнародным партнёрам Індыі. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы ў інтэрв'ю БЕЛТА напярэдадні свайго афіцыйнага візіту ў нашу краіну.**

«Індыя была адной з першых краін, якія ўстанавілі дыпламатычныя адносіны з Беларуссю пасля набыцця ёю незалежнасці ў 1991 годзе. Былы прэм'ер-міністр Індыі Раджыў Гандзі наведаў Мінск у 1985 годзе — гэта было ў ходзе яго візіту ў Савецкі Саюз. Для мяне вялікі гонар быць першым прэзідэнтам Індыі, які наведвае Беларусь. Мой візіт заклікаы вывесці адносіны Індыі з Беларуссю на больш высокі ўзровень», — падкрэсліў Пранаб Мукерджы.

Паводле яго слоў, Індыя — велізарны рынак і эканамічны гігант — хацела б бачыць хуткае і значнае ўмацаванне сувязяў з Беларуссю. «Беларусь з'яўляецца цэнтрам Еўразіі, гэта мост паміж Еўропай і Азіяй. І развіццё ўзаемнага супрацоўніцтва, безумоўна, пойдзе на карысць двух нашых народаў. Я спадзяюся, што першы афіцыйны візіт Прэзідэнта Індыі ў Беларусь актывізуе нашы двухбаковыя адносіны і мы пашырым узаемадзеянне ў многіх галінах», — дадаў Пранаб Мукерджы.

Ён таксама адзначыў, што Індыя зацікаўлена ва ўзаемадзеянні з Еўразійскім эканамічным саюзам. «Нашы перамовы па ўсёабдымным эканамічным партнёрстве з ЕАЭС ідуць добра. Мы агаварылі сферу кампетэнцыі сумеснай групы, якая падрыхтуе папярэдняе абгрунтаванне мэтазгоднасці ўдзелу ў праекце. Дарэчы, мы паставілі перад сабой амбіцыйныя тэрміны, каб завяршыць увесь працэс», — сказаў Прэзідэнт Індыі.

«Мы прымем дарожную карту па развіцці адносін нашых краін, якая акрэсліць асноўныя напрамкі і далейшыя крокі да дасягнення жаданых вынікаў. У нас ёсць вялікі патэнцыял у такіх сектарах, як традыцыйная і малая энергетыка, новыя і аднаўляльныя крыніцы энергіі, металургія і горназдабыўная прамысловасць, аўтамабільная і сельскагаспадарчая тэхніка, фармацэўтыка, нафта і газ, сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць. Мы таксама можам пашырыць наша ўзаемадзеянне ў сферы паслуг — гэта IT, ахова здароўя, фінансы, транспарт і лагістыка», — падкрэсліў Пранаб Мукерджы.

Паводле яго слоў, цяперашні ўзровень узаемнага гандлю паміж дзвюма краінамі, які складае каля $400 млн, значна ніжэйшы за існуючы патэнцыял. «Мы павінны шчыльна заняцца гэтым пытаннем і дамагчыся значна больш высокіх паказчыкаў у гандлі і інвестыцыях. Умацаванне нашых гандлёвых і інвестыцыйных сувязяў будзе адным з галоўных пытанняў парадку дня маючых адбыцца перамоў з Прэзідэнтам Беларусі, — адзначыў Пранаб Мукерджы. — Мы імпартуем значную колькасць калійных угнаенняў з Беларусі, што неабходна для нашай праграмы харчовай бяспекі. Індыйскія кампаніі зацікаўлены ў доўгатэрміновых дамоўленасцях па пастаўках калійных угнаенняў з Беларусі. Такім чынам Беларусь атрымае гарантаваны рынак, а Індыя — надзейнага пастаўшчыка. Нашы кампаніі таксама адкрыты для інвестыцый у беларускія калійныя руднікі, калі прапанаваныя ўмовы акажуцца камерцыйна выгаднымі». «Варта адзначыць, што метады вядзення сельскай гаспадаркі ў Індыі мяняюцца, і нам спатрэбіцца тэхніка, якая вырабляецца беларусамі. Было б добра, калі б беларускія кампаніі стварылі дачныя або сумесныя прадпрыемствы ў Індыі для задавальнення патрэб вялізнага індыйскага рынку», — лічыць Пранаб Мукерджы.

### Тры пытанні да ўлады

# КАБ АКТЫЎНЕЙ КУПЛЯЛІ БЕЛАРУСКАЕ

**Слоган «Купляй беларускае!» па-ранейшаму актуальны і нават стаў своеасаблівым брэндам. Нядаўна ў Віцебску працавала выстава, на якой прадставілі вытворчы патэнцыял усяго Прыдзвінскага рэгіёна. Адбылася і нарада па пытаннях насычэння ўнутранага рынку нашымі ж таварамі. Яе выніні пракаментаваў Алег МАЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.**

***— Якім чынам, на ваш погляд, можна павялічыць рэалізацыю беларускіх тавараў?***

— На ўнутраным рынку пакупнікоў можна прывабіць высокай якасцю і параўнальна даступнай цаной. На Віцебшчыне многае зроблена, каб якасць прадукцыі адпавядала самым высокім сусветным стандартам. Гэта вынік мадэрнізацыі прадпрыемстваў, дзе вырабляюць мяса-малочную прадукцыю, іншыя харчовыя і прамысловыя тавары.

***— Вядома, трэба і прыгожа ўпакаваць тавар, актыўна яго рэкламаваць. Гэта таксама цэлая навука. Ці варушацца нашы вытворцы ў гэтым пытанні?***

— Безумоўна, каб павялічыць збыт, трэба абавязкова паклапаціцца пра «кідкую» ўпакоўку. Ад таго, як яна выглядае, таксама шмат што залежыць. Гэта можа павысіць запатрабаванасць прадукцыі. Пры гэтым, вядома, якасць павінна быць добрай... Ахвотна купляюць нешта, калі напісана, што прадукцыя экалагічна чыстая. І, безумоўна, гэта павінна адпавядаць рэчаіснасці. Па даручэнні губернатара прапрацоўваецца пытанне па адкрыцці ў абласным цэнтры першай спецыялізаванай крамы. Там будуць прадавацца толькі экалагічна чыстыя тавары мясцовай вытворчасці. Потым аналагічныя гандлёвыя пункты з'явяцца ў іншых буйных гарадах Віцебшчыны.

***— Верагодна, да такіх праектаў праяўляюць інтарэс і патэнцыйныя замежныя інвестары?***

— Аблвыканкамам падпісана пагадненне з кітайскай карпарацыяй, якая сярод іншага гатова ўкладваць грошы ў выраб экалагічна чыстай энергіі: у будаўніцтва гідраэлектрастанцый, ветраўстановак. Ёсць інтарэс і да інвеставання ў сельскагаспадарчую галіну, а канкрэтна — у вырошчванне і перапрацоўку лёну. Не выключаецца інвеставанне ў вытворчасць прадуктаў харчавання. Апошнія гасцям з Кітая вельмі спадабаліся падчас дэгустацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

### Курсавая розніца

# ПЕРШЫ. АЛЕ ДВАЙНЫ

## Прайшлі біржавыя таргі ў рэжыме бесперапыннага двайнога аўкцыёну

**«Можна канстатаваць, што новы рэжым з гэтага дня функцыянуе ў поўным аб'ёме і першыя таргі па асноўных валютах адбыліся паспяхова», — сказаў намеснік старшыні праўлення Беларускай валютна-фондавай біржы Сяргей ЦІННІКАЎ. Сярэднеўзважаны курс долара ЗША склаў 14815 рублёў, еўра — 16154, расійскага рубля — 278,75.**

Такім чынам, у параўнанні з вынікамі біржавых таргоў 29 мая, якія праводзіліся ў рэжыме фіксінгу, курс долара знізіўся на 75 рублёў, еўра — на 146, расійскага рубля — на 1,75. Сярэднеўзважаныя курсы валют вызначаліся па выніках асноўнай сесіі і перыяду закрыцця.

Валатыльнасць (зменлівасць) курсу сёння склала 1%. «Мы гэтага і чакалі. З часам, магчыма, гэты паказчык будзе ўваходзіць у больш вузкі калідор, мы на гэта спадзяёмся, — заявіў Сяргей Цінніках. — Але дакладныя высновы можна будзе рабіць праз адзін-два тыдні».

Нагадаем, што раней біржавыя таргі ў Беларусі праводзіліся ў рэжыме фіксінгу, пры якім усе здзелкі па адной замежнай валюце ажыццяўляліся па адным і тым жа курсе. Падчас новых таргоў курсы заключаных здзелак могуць адрознівацца. Двайны аўкцыён — форма правядзення біржавых таргоў рознымі фінансавымі інструментамі. Гэта самая папулярная падобная сістэма ў свеце. Ва ўмовах такога рэжыму ўдзельнікі таргоў маюць магчымасць падаваць заяўкі на куплю і продаж замежнай валюты на працягу ўсяго перыяду правядзення таргоў, пры гэтым заключэнне здзелак адбываецца пры наяўнасці ў гандлёвай сістэме сустрэчных заявак са здавальняючымі ўмовамі.

Сфарміраваны па выніках таргоў сярэднеўзважаны курс па долары ЗША, еўра і расійскім рублі будзе выкарыстоўвацца Нацбанкам у якасці афіцыйнага курсу беларускага рубля да гэтых валют з дня, наступнага за днём правядзення таргоў.

У сувязі з увядзеннем рэжыму бесперапыннага двайнога аўкцыёну на біржавым валютным рынку будуць здзяйсняцца толькі здзелкі куплі-продажу замежнай валюты банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі ад свайго імя і за свой кошт, а таксама ад свайго імя і па даручэнні кліентаў пры абавязковым продажы замежнай валюты.

Па здзелках абавязковага продажу банкі будуць разлічвацца з кліентамі па сярэднеўзважаным курсе, разлічаным па здзелках банка, якія адбыліся падчас гандлёвай сесіі. Такім чынам, курс абавязковага продажу ў адным банку можа адрознівацца ад сярэднеўзважанага курсу гандлёвай сесіі і ад курсу абавязковага продажу ў іншых банках як у адзін, так і ў другі бок.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1413193, 1376401, 1376402, 1395826, 1159379, 1159381, 1159395, 1186556, 1229948, 1237331, 1237345, 1249675, 1270846, 1270848, 1270850, 1274881, 1274884, 1274890, 1291868, 1291869, 1291881, 1291894, 1291903, 1291912, 1301227, 1301228, 1301237, 1301238, 1301252, 1301261, 1301264, 1301265, 1301267, 1301268, 1336886. УНП 100782388

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЧЭРВЕНІ

*3, серада,* **9.30 — 24.00**
*4, чацвер,* **0.00 — 2.30**
*5, пятніца,* **13.00 — 24.00**
*6, субота,* **0.00 — 7.30**
*7, нядзеля,* **16.30 — 24.00**
*8, панядзелак,* **0.00 — 10.30**
*9, аўторак,* **20.00 — 24.00**
*10, серада,* **0.00 — 13.30**
*12, пятніца,* **0.00 — 16.00**
*13, субота,* **6.30 — 19.00**
*14, нядзеля,* **8.00 — 19.30**
*16, аўторак,* **16.00 — 23.30**
*19, пятніца,* **5.30 — 8.00**
*21, нядзеля,* **18.00 — 19.00**
*24, серада,* **7.00 — 8.30**
*26, пятніца,* **2.30 — 19.00**
*29, панядзелак,* **4.00 — 5.30**
*30, аўторак,* **19.30 — 24.00**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1. Легковой автомобиль ГАЗ-21Р, седан, 1970 г.в, гос. №7903 ЕА-2, стоимостью 5 580 000 бел. рублей.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Беляев Валерий Александрович, проживающий по адресу: г. Витебск, ул. 14-я Полоцкая, 52 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Терешковой, 9 (ВОУП «Автосервиса и торговли») |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 15.06.2015 в 10.00 г. Витебск, ул. Кирова, 16, кабинет 3 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска главного управления юстиции Витебского облисполкома 210001, г. Витебск, ул. Кирова, 16 Заместитель начальника отдела Дашкевич Ольга Владимировна тел. (80212) 608449, начальник отдела Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212)608442 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № **р/с 3642903000328** в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 11.00 5.06.2015 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии со ст. 486 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

## Извещение о проведении 06.07.2015 аукциона с шагом 5% по продаже имущества ОАО «СУКНО», находящегося по адресу: г. Минск, ул. К. Цеткин, 5.

| | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | 1. Двухпрочесный аппарат БЕФАМА CR-24 К АЧВШ-2М. 2. Вязально-прошивная машина ВП-180 к ЧВШ-2М. | 94 820 400 | 9 482 040 |
| Лот №2 | 1. Двухпрочесный аппарат БЕФАМА CR-24 К АЧВШ-4М. 2. Машина для производства ватина АЧВШ 4М. | 90 718 800 | 9 071 880 |
| Лот №3 | 1. Чесальный аппарат CR-643 «БЕФАМА». | 33 608 400 | 3 360 840 |
| Лот №4 | 1. Аппарат трехпрочесный БЕФАМА ПНР CR-24. 2. Обезрепеивающее устройство (морели к чесальному аппарату). | 137 350 800 | 13 735 080 |
| Лот №5 | 1. Красильный аппарат собственного изготовления. | 35 731 200 | 3 573 120 |
| Лот №6 | 1. Центрифуга б/у ТВ-1500-3. | 57 018 000 | 5 701 800 |

Аукцион состоится **06.07.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **02.07.2015 в 10.00.**

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «СУКНО» (Лот №__), проводимом 6 июля 2015 г.

Условия участия, порядок проведения аукциона, срок заключения договора купли-продажи и условия оплаты содержатся на сайте РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) ino.by. Телефоны для справок: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.

■ У добры шлях

# ДА ПАБАЧЭННЯ, ШКОЛА!

## Выпускнікі ў Мінску развіталіся з гімназіяй па-беларуску

**У сталічнай гімназіі №23, навучанне ў якой вядзецца на беларускай мове, да свята апошняга школьнага званка рыхтуюцца, як і ва ўсіх іншых школах. Вачам балюча глядзець на падсвечаную сонцам белізну дзявочых бантоў, усё стракаціць ад каляровых букетаў і паветраных шароў. Гавораццa ўрачыстыя прамовы, уручаюцца граматы і падзячныя лісты, гучаць віншаванні... Асаблівa ўрачыста выглядаюць чацвёртакласнікі, у якіх з-пад пінжачкоў і камізэлек школьнай формы выглядваюць вышываныя рукавы ды каўнерыкі. Сучасныя бацькі на адну з самых важных жыццёвых падзей апранулі дзяцей з нацыянальным каларытам — выпускнікоў чацвёртага класа чакае іх першы ў жыцці іспыт для пераходу з малодшай школы ў сярэднюю. Белымі стужкамі з беларускім арнаментам прыцягвалі ўвагу і вучні выпускнога 11 «А», які назаўсёды развітваўся са школьным жыццём.**

**Уладзімір і Святлана ДЗЯДОВЫ** хвалююцца, як і іх сын, а мо і больш: для Станіслава вось-вось прагучыць апошні школьны званок. Яны, як і іх выпускнік, прыйшлі на лінейку ў вышыванках.

— Сёння свята, наш сын заканчвае школу, у якой меў магчымасць навучацца на беларускай мове, — тлумачыць спадарыня Святлана, — а ідэя апранацца ў традыцыйны строй прыйшла яму ў галаву яшчэ на пачатку года.

Галоўнае, чаго цяпер жадаюць бацькі Станіславу, — гэта знайсці сваё месца ў жыцці, а ва ўсім астатнім, як і сёння, яны яго падтрымаюць. Зрэшты, малады чалавек ужо вызначыўся са сваёй будучыняй: збіраецца паступаць на механіка-матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Выбраная спецыяльнасць — тэхнічная — механік-канструктар, але Стась не сумняваецца: любоў да роднай мовы з ім застанецца і надалей, як і любоў да Радзімы.

— Я вельмі ўдзячна гімназіі за тое, што яна стала для мяне маленькім востравам чагосьці роднага, беларускага, удзячна настаўнікам. Школа сапраўды стала для мяне другім домам. Таму і пачуцці цяпер трохі змяшаныя — і добра, і крыху сумна, — прызнаецца другая выпускніца, Карына Дрозд, якая збіраецца вучыцца на архітэктара ў БНТУ.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Для **класнай кіраўніцы 11 «А» Алены Міхайлаўны ПІСАРЧЫК** гэта першы выпуск, і яна кажа, што вельмі шкада адпускаць вучняў.

— Але ім трэба ісці далей, дасягаць новых поспехаў, не спыняцца. Бо пакуль што была толькі падрыхтоўка, а самае галоўнае — наперадзе. Бывалі ўсялякія сітуацыі, у тым ліку і складаныя, але вельмі часта дзеці самі мяне падтрымлівалі, і мы разумелі адно аднаго. Усе яны розныя, з рознымі характарамі і мэтамі, але мы ўсе — адзін клас.

Сучасныя выпускнікі, па словах настаўніцы, вельмі самастойныя і мэтанакіраваныя, але — ціхя і недаверлівыя: не скажуць, чаго яны хочуць, іх трэба вывучаць.

— Самае галоўнае, чаго б хацелася пажадаць выпускнікам, — гэта чалавечага шчасця і здароўя. Ну і каб яны нас не падвялі: мы чакаем, што яны дакажуць — у гімназіі даюць добрыя і якасныя веды. Але тут, я думаю, нам сорамна не будзе. А яшчэ нашы дзеці — сапраўдныя патрыёты, якія будуць жыць і працаваць дзеля росквіту роднай краіны.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■ Выстава

# МАЛОЧНЫЯ РЭКІ ЦЯКУЦЬ І ПРАЗ АКІЯН?

## Пашыраецца геаграфія экспарту сельгаспрадукцыі

**Сёння стартуе «Белагра-2015». На 25-ю міжнародную спецыялізаваную выставу ў нашу краіну прыедуць прадстаўнікі больш як 500 кампаній з 23 краін. Як відаць, цікавасць да беларускага боку ў сельскагаспадарчай прамысловасці больш чым вялікая. Тым не менш першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід МАРЫНІЧ адзначае падзенне экспарту арганізацый Мінсельгасхарча за год на 26,7%.**

### КАНКУРЭНТЫ ДЭМПІНГУЮЦЬ

Адной з асноўных прычын падзення экспарту беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі сёлета з'яўляецца зніжэнне коштаў.

Па папярэдніх звестках, якія агучыў Леанід Марыніч, экспарт арганізацый Мінсельгасхарча за студзень—май сёлета склаў каля 890 млн долараў, або ўсяго 73,3% да ўзроўню аналагічнага перыяду 2014 года. Значна асеў асноўны для Беларусі рынак — расійскі. І адной з галоўных прычын першы намеснік міністра назваў зніжэнне экспартных цэн у параўнанні з мінулым годам. Гэта, адзначыў ён, звязана і са зніжэннем пакупніцкай здольнасці суседняй краіны.

«Акрамя таго, нашы канкурэнты пастаўляюць тавар па цэнах, значна ніжэйшых за нашы, і расійскія кампаніі маюць права выбіраць іх. У цэлым на ўсё, што нам давала асноўны прыбытак на выніках экспарту прадукцыі, сёння цэны ўпалі», — канстатаваў Леанід Марыніч.

Назіраецца і скарачэнне аб'ёмаў пастаўкі асобных відаў прадукцыі. Напрыклад, ялавічыны ў студзені—красавіку сёлета экспартавана на 28,6% менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, каўбасных вырабаў — на 50,2%, сухога суцэльнага малака — на 12,7%.

З улікам гэтага ўсё больш актуальнай становіцца задача па дыверсіфікацыі экспарту. Так, сёлета ўжо адбыліся візіты прадстаўнікоў Мінсельгасхарча ў Ізраіль, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, ЗША, Шры-Ланку, Алжыр, Германію, Інданезію, Грузію, Кітай, Пакістан. «Мяса-малочная кампанія» прапрацоўвае пытанні пастаўкі прадукцыі ў Бангладэш, Алжыр, Ліван, краіны Персідскага заліва, ЗША.

«У красавіку гэтага года «Мяса-малочная кампанія» паставіла пробную партыю сухога абястлушчанага малака агульным аб'ёмам у 100 т на тэрыторыю Нігерыі. Падпісаны кантракт з найбуйнейшай ізраільскай кампаніяй «Магнезіт Груп» аб пастаўках сухога абястлушчанага малака і іншай малочнай прадукцыі. Яшчэ падпісалі доўгатэрміновы кантракт з турэцкай кампаніяй «Рейпер Груп», згодна з якім запланавана адгрузка 28 т масла і 25 т сухога абястлушчанага малака. Па выніках візіту ў Пакістан маецца рамачны кантракт на пастаўку малочнай прадукцыі на 10 млн долараў. Праца вядзецца і па пытаннях пастаўкі ў Кітай», — расказаў першы намеснік міністра.

### УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ НАВАТ ЗША І КІТАЙ

«Белагра-2015» будзе праходзіць у сталіцы з 2 па 6 чэрвеня.

«Беларусь прадстаўляюць 386 кампаній, Расію — 26, Германію — 17, Польшчу — 16, Кітай — 14. Акрамя таго, будуць удзельнікі з Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, Літвы, Латвіі, Нідэрландаў, Іспаніі, Італіі, Славеніі, Украіны, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі», — адзначыў Леанід Марыніч.

Сярод тых, хто першы раз будзе ўдзельнічаць у выставе, — Злучаныя Штаты Амерыкі, Кітай, Венгрыя, Польшча, Германія. Паводле слоў першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі, нягледзячы на тое, што сёлета арганізатарам прыйшлося адмовіцца ад адной з пляцовак выставы — «Гастэлаўскае», ніякіх абмежаванняў па плошчы ўдзельнікам прад'яўлена не будзе.

У дні «Белагра» пройдуць дзве міжнародныя спецыялізаваныя выставы — «Белферма-2015» і «Белпрадукт-2015». Традыцыйна пройдуць конкурсы «Найлепшая племянная карова малочнай пароды», конкурс аратых, у якім упершыню прыме ўдзел каманда з Расіі, «Чэмпіён смаку», а таксама выстава пародзістай птушкі і іншыя мерапрыемствы.

Экспазіцыі размесцяцца ў Мінску ў Футбольным манежы (пр. Пераможцаў, 20/2). Выстава будзе працаваць з 10.00 да 18.00 за выключэннем апошняга дня, калі яе праца будзе доўжыцца да 14.00.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Сезон

## Пенсіянерам-дачнікам — месцы на рынках

**Рынкі сталіцы прапануюць пенсіянерам і інвалідам бясплатныя месцы для продажу дачнай прадукцыі, паведамілі ва ўпраўленні гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.**

Гаворка ідзе пра Чыжоўскі, Чэрвеньскі, Маскоўскі, Курасоўшчынскі, Камароўскі рынкі, а таксама рынкі «Гандлёвыя рады», «Свелта», «Серабранка», «Велазаводскі», «Малінаўка», «Уральскі», «Уручча-3», «Ракаўскі кірмаш», «Заходні», «Ждановічы». Гандлёвыя месцы будуць давацца пенсіянерам і інвалідам для рэалізацыі імі да 20 кілаграмаў сельскагаспадарчай прадукцыі, вырашчанай на сваіх зямельных участках. Каб атрымаць такую магчымасць, названым катэгорыям трэба прад'явіць дакументы, што пацвярджаюць права на льготу. Скарыстацца бясплатнымі гандлёвымі месцамі на сталічных рынках ахвотныя змогуць з 1 чэрвеня да 1 снежня.

## У Варну — цягніком

**На летні перыяд Беларуская чыгунка прызначыла цягнік міжнародных ліній №374/373 Мінск — Варна (Балгарыя).**

Ён будзе курсіраваць з 17 чэрвеня па 9 верасня. Перыядычнасць — адзін раз на тыдзень. З Мінска цягнік будзе адпраўляцца па серадах, а з Варны — па пятніцах (з 19 чэрвеня па 11 верасня). Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 13.18, прыбыццё ў Варну — праз суткі ў 10.15. Час адыходу цягніка ў зваротным кірунку — 19.15, прыбыцця ў нашу сталіцу — праз суткі ў 16.59.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

**У Віцебску на плошчы Перамогі ў нядзелю адбылося свята «Сябруюць дзеці на планеце», прысвечанае Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Мерапрыемства было і вясёлым, і карысным.**

Арганізатары — аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама, а таксама кіраўнікі творчых калектываў і іншыя ўдзельнікі свята шчыра спадзяваліся, што надвор'е не падвядзе. І неба парадавала адсутнасцю дажджу.

Шмат людзей у выхадны дзень прыйшлі на плошчу. Выступіў тэатр ростававых лялек, публіку забаўлялі клоўны, бурнымі апладысментамі гледачы падзякавалі за выступленне майстрам усходніх адзінаборстваў, іх вучням. Яны так класна паказалі прыёмы рукапашнага бою, што некаторыя назіральнікі пасля ўбачанага захацелі запісацца ў секцыю. Была арганізавана і выстава аўтамабіляў. Супрацоўнікі ДАІ праводзілі прафілактычныя гутаркі, валанцёры з Чырвонага Крыжа, іншых грамадскіх арганізацый распавядалі пра тое, як бяспечна правесці лета. А падчас дабрачыннай акцыі «Дары дабро» збіраліся грошы для Віцебскага абласнога дома дзіцяці.

Багатая канцэртная праграма, прыемныя сюрпрызы і прызы для пераможцаў конкурсаў і спаборніцтваў — гэта і іншае ствараць добры настрой.


Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Духоўнасць

**Усё пачыналася з некалькіх дзясяткаў людзей, якія ішлі на фэст у Будславе. Цяпер колькасць вернікаў, што збіраюцца да аднаго з найпрыгажэйшых беларускіх касцёлаў, вымяраецца дзясяткамі тысяч. І шлях да святыні ў кожнага свой...**

# ШЛЯХ, ЯКІ АДОЛЕЕМ РАЗАМ

## Будслаўскую пілігрымку — у Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА

З Чырвонага касцёла, што ў беларускай сталіцы, звычайна выпраўляецца 50-60 вандроўнікаў. Іх называюць «галодная пілігрымка» — бо гэту дарогу ў Мядзельскі раён яны пераадольваюць, сілкуючыся толькі хлебам і вадой. Да таго ж нясуць з сабою вялізны крыж. Каб нагадаць усім, хто будзе бачыць іх, пра сэнс укрыжавання і ўваскрэсення Хрыста. Каб самім глыбей усвядоміць гэтую ахвяру за грахі свету і кожнага з нас асабіста. Свае пілігрымкі выходзяць і з іншых куткоў краіны. Людзі ідуць з Брэста, Ліды, Полацка... Ад усёй колькасці вернікаў, што збіраюцца на фэст у Будславе, 10% ідзе пешкі, адзначае архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч.


Фота Надзеі БУЖАН.

Прыйшоўшы да прызначанага месца, многія ставяць намёты — збіраецца цэлы лагер пілігрымаў. А ўначы сярод намётаў ладзіцца імправізаваны канцэрт духоўнай музыкі — атрымліваецца вельмі кранальна і шчыра, з'яўляецца адчуванне, што слухае само неба...

Ёсць ідэі разнастаіць праграму Будслаўскага фэсту. Бо на галоўныя набажэнствы ў касцёл усе ахвотныя адначасова трапіць не могуць. Прапануецца ладзіць духоўныя чытанні паэтаў, пісьменнікаў — пашыраць спосабы, якімі ісціна можа трапіць да тых, хто шукае і гатовы пачуць.

### «НЕ МАЕ АНАЛАГАЎ У САКРАЛЬНАЙ АРХІТЭКТУРЫ»

Чаму ж для такой дзеі выбраны менавіта Будслаў? Той, хто калі-небудзь бачыў гэты касцёл, наўрад ці зможа застацца абыякавым, не адчуць яго велічнасць. Адразу зразумела, што будавалі людзі калісьці не для сябе, а каб магутнасцю гмаху ўславіць веліч Бога. Будынак складаецца з дзвюх частак: старога касцёла (сёння гэта капліца), пабудаванага ў 1633—1643 гадах, і новага, узведзенага ў 1767—1783 гадах. Такім ён дайшоў і да нашага часу.

У старым касцёле знаходзіцца арыгінальны разьбяны драўляны алтар эпохі ранняга барока. Кампазіцыя алтара, як сведчаць даследчыкі, не мае аналагаў у сакральнай архітэктуры Літвы і Польшчы. На сценах касцёла да нашых дзён захаваліся ўнікальныя роспісы — восем сюжэтаў, якія з'яўляюцца выдатнымі помнікамі ранняга класіцызму.

Сам комплекс былога кляштара бернардзінцаў, а таксама дэкаратыўнае аздабленне касцёла: галоўны і бакавыя алтары, роспісы — унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны як помнік першай катэгорыі. У 1994 годзе Будслаўскаму касцёлу нададзены тытул Базылікі меншай. Такім званнем храмы звычайна ўзвялічваюцца з-за свайго ўзросту, памеру ці гістарычнага значэння. Вернікі мараць, што калі-небудзь касцёлу будзе нададзена званне Базылікі. Але такі статус надае толькі асабіста Папа Рымскі, прызнаючы тым самым значнасць храма.

### ПАД ГУКІ АРГАНА АЖЫВАЮЦЬ МАРЫ

Каб спрычыніцца да велічнай святыні і падтрымаць яе, Беларускі фонд культуры і Беларускі камітэт Міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) аб'явілі аб пачатку рэспубліканскай акцыі па збору пазабюджэтных сродкаў на рэстаўрацыю Будслаўскага касцёла бернардзінцаў.

Рэстаўрацыі патрабуе найперш драўляны алтар базылікі. У нас спецыялістаў, здольных выканаць такую працу, няма, таму, калі грошы будуць сабраныя, плануецца запрасіць майстроў з Польшчы. Таксама рэстаўрацыйнае абнаўленне патрэбна інтэр'еру храма. Маецца і старажытны арган, які пакуль не працуе, але «ажывіць» яго цалкам магчыма. Пачуць калі-небудзь канцэрт арганнай музыкі ў славутым касцёле — гэта, думаецца, будзе падобна на адну са спраўджаных мараў...

Каштарыс неабходных работ ужо пачынаюць выконваць на дабрачынных пачатках. Навуковым кіраўніком праекта прызначаны галоўны архітэктар «Белрэстаўрацыі» Андрэй Карпук. Ён, дарэчы, адзначыў, што ў касцёле ёсць старажытны вежавы гадзіннік, які пакуль не працуе. Але пры ўмелым падыходзе можна зрабіць так, каб стары гадзіннік зноў ішоў...

### АХВЯРАВАЛЬНІКАЎ УШАНУЮЦЬ

Арганізатары збору сродкаў на рэстаўрацыю заклікаюць далучацца да гэтай справы прадстаўнікоў усіх канфесій. Як у пілігрымцы ўдзельнічаюць хрысціяне, што прытрымліваюцца самых розных традыцый — акрамя каталікоў, таксама праваслаўныя, пратэстанты, уніяты — так і да ахвяраванняў варта падключыцца ўсім. «Адновім Будслаўскі касцёл разам» — такі слоган акцыі прапануе намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Анатоль Бутэвіч. І гэта вельмі сімвалічна: аб'яднаўшыся ў такой акцыі, вернікі розных канфесій змогуць аб'ядноўвацца і для іншых мэтаў, для сумесных малітваў за Беларусь.

Усе ахвяравальнікі будуць пэўным чынам ушанаваныя — іх імёны з'явяцца на спецыяльнай памятнай дошцы ў Будслаўскім касцёле (ці напісаныя на цаглінках), а таксама будуць надрукаваныя ў «Краязнаўчай газеце».

«Звязда» з'яўляецца інфармацыйным партнёрам акцыі па збору сродкаў. На старонках нашага выдання вы зможаце сачыць за тым, як аднаўляецца будслаўская святыня.

Міністэрства культуры Беларусі выступіла з прапановай Будслаўскі фэст унесці ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, што надасць яму яшчэ большую значнасць. Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ЮНЕСКА Павел Латушка будзе спрыяць таму, каб фэст быў узяты пад патранат гэтай арганізацыі.

Нагадаем, што сёлета Будслаўскі фэст адбудзецца з 4 на 5 ліпеня. Здаецца, самы час, каб падрыхтавацца і знайсці сваю дарогу да храма...

*Каб паўдзельнічаць у акцыі па зборы сродкаў на рэстаўрацыю Будслаўскага касцёла, пералічвайце грошы на наступны рахунак: 3015741330015 у ЦБУ №539 г. Мінска ААТ «Белінвестбанк», код 739, Мінск, вул. Калектарная, 11, БІК 153100739, УНП 100081886, АКПА 37449864; з пазнакай «На рэстаўрацыю Будслаўскага касцёла». Тэлефон бухгалтара (+375 17) 283 28 24.*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# АДРЫНУ, ЯКАЯ ЗАГАРЭЛАСЯ АД МАЛАНКІ, АДНОВЯЦЬ

**Як ужо паведамляла «Звязда», на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, што ў вёсцы Азярцо пад Мінскам, ад удару маланкі загарэўся ўнікальны помнік традыцыйнага гаспадарчага дойлідства. Гэта старадаўняя адрына, перавезеная сюды з вёскі Левановічы Пастаўскага раёна, якая знаходзіцца на тэрыторыі экспазіцыйнага сектара Паазер'е.**

У музеі драўлянай архітэктуры працуе ўласная пажарная часць, маюцца дзве пажарныя машыны, у што ўкладзены досыць значныя дзяржаўныя сродкі. Таму пакуль незразумела, чаму яны не змаглі аператыўна патушыць агонь.

**Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Ігар ЧАРНЯЎСКІ** адзначае:

— Мы будзем высвятляць, чаму так адбылося. Аднак знайсці вінаватага заўсёды проста. Цяпер галоўнае — прыняць меры па захаванні. Па-першае, я не ўпэўнены, што ў музеі ёсць запас саломы, каб накрыць новы дах. Давядзецца чакаць будучага ўраджаю, каб менавіта зжаць, а не скасіць салому. Па-другое, трэба правесці мерапрыемствы па кансервацыі, каб раскрытая будыніна не пашкодзілася далей. Фактычна, там знішчаны толькі салома і кроквы. Апошнія насамрэч захаваліся, але абгарэлі, таму давядзецца мяняць. Зруб і адкрытая частка будынка не пагарэлі.

Музей у вёсцы Азярцо, што размяшчаецца на некалькіх гектарах, сфарміраваны з драўляных забудоў, перавезеных сюды з розных куткоў нашай краіны — Палесся, Панямоння, Падняпроўя. Разам сабраны найбольш яскравыя прыклады драўлянага дойлідства.



Вёска мяняецца досыць імкліва, як адзначае спецыяліст. Таму прыкладаў драўлянай архітэктуры па-за межамі музея застаецца ўсё меней. У большай ступені цікавыя прыклады такога дойлідства яшчэ можна адшукаць на Палессі.

■ Пасля падзеі

# У Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў — новы старшыня

## Ім абраны Алесь Суша

**Пра гэта стала вядома падчас закрыцця VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, якое адбывалася ў Акадэміі навук у Мінску.**


Фота Яўгена ПАМЫТКІНА.

Алесь Суша працуе намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Ён вядомы тым, што актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое будзе адзначацца ў 2017 годзе. Яго часта можна бачыць на самых розных мерапрыемствах, прысвечаных не толькі кніжнай спадчыне, але і ўвогуле беларускай гісторыі і культуры. Ён заўсёды выступае з дакладнымі і яснымі прамовамі.

Былы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў гісторык Міхаіл Касцюк павіншаваў свайго маладога пераемніка і ўрачыста перадаў пячатку асацыяцыі. У сваю чаргу Алесь Суша адзначыў, што быць новым старшынёй для яго вялікі гонар, якому неабходна адпавядаць.

Згодна са статутам асацыяцыі, намеснікаў выбірае сам старшыня — дзеля таго, каб арганізацыя была сапраўды дзейснай. Алесь Суша прапанаваў, каб склад замежнага прадстаўніцтва каміттэта беларусістаў застаўся тым жа. У яго па-ранейшаму будуць уваходзіць Рыгор Піўтарак з Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, Юрый Лабынцаў з Расійскай акадэміі навук, Міхал Саевіч з Універсітэта імя Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне (Польшча) і іншыя — усе яны з'яўляюцца актыўнымі даследчыкамі беларусістыкі.

Што датычыцца беларускага прадстаўніцтва, то (пры згодзе кандыдатаў) намеснікам старшыні (і кіраўніком рэспубліканскага аддзялення) будзе Ірына Багдановіч з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; яшчэ адным намеснікам, адказным за арганізацыйна-распарадчыя пытанні, стане навуковец з Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі Сяргей Гаранін. Увойдуць у камітэт і яшчэ некаторыя апантаныя беларусазнаўцы.

Нагадаем, што Міжнародны кангрэс беларусістаў праходзіць раз на чатыры-пяць гадоў. Аднак, па словах новага старшыні, яны будуць імкнуцца да таго, каб працаваць і паміж кангрэсамі.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Музыка без межаў

# «ІДЭАЛЬНАЯ ФОРМУЛА» БЕЛАРУСКАЙ АКАРЫНЫ,

## або Чым нашы майстры здзівілі італьянцаў

**Чамусьці прайшла незаўважанай адна з найярчэйшых сусветных культурных падзей, у якой прынялі ўдзел і беларусы — міжнародны фестываль акарын у Італіі. Пэўна, праз сціпласць нашых удзельнікаў, а можа, праз тое, што акарына — від так званай шарападобнай флейты — не самы папулярны сёння ў Беларусі музычны інструмент. Напэўна, дарэмна, бо не проста так у італьянскім горадзе Будрыа, што недалёка ад Балоньі, ужо колькі гадоў яму прысвячаюць цэлы фэст!**



Беларускія акарыністкі падчас выступлення на фестывалі.

А пачалося ўсё з таго, што **Настасся ДУМАНСКАЯ, якая выкладае ігру на акарыне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў**, ведаючы гістарычную радзіму гэтага інструмента — Будрыа, вырашыла абавязкова трапіць у гэтае гістарычнае месца. Знайшла ў інтэрнэце інфармацыю пра фестываль, падала заяўку на ўдзел і атрымала станоўчы адказ! Настассю не спалохалі ні адлегласць, ні адсутнасць вопыту ўдзелу ў такім мерапрыемстве, ні тое, што пра беларускую акарыну мала ведаюць за мяжой. У падарожжа наша дэлегацыя выправілася ў складзе музычнага трыа акарыністак — Настассі Думанскай, Інэсы Шчукі, Настассі Барысёнак, а таксама кераміста, майстра па вырабе акарын Івана Дашкова.

— Вельмі здзівіла тое, што нашы інструменты, выкананне, ды і музыка для акарын вельмі адрозніваецца ад сусветных, хаця, здавалася б — адна і тая ж акарына, — дзеліцца ўражаннямі Настасся Думанская. — А яшчэ здалося дзіўным, што на гэтым інструменце больш іграюць кітайцы, японцы, карэйцы, чым еўрапейцы.

**Для італьянцаў наш удзел стаў абсалютным адкрыццём Беларусі і беларускіх музыкаў, яны не ведалі, што ў нас увогуле робяць акарыны. Мы выскачылі як чорт з табакеркі.**

Цягам трох фестывальных дзён дзяўчаты знаёмілі міжнародную публіку з творамі беларускіх кампазітараў і інтэрпрэтацыямі беларускіх песень, выконваючы іх на акарынах. Па словах Настассі, людзі падыходзілі і прызнаваліся, што ім вельмі падабаецца, хвалілі прафесіяналізм нашых выканаўцаў.

— Аднак быў і такі момант: я запыталася ў арганізатара, аднаго з лепшых акарыністаў Італіі, што ён думае пра нас. Ён адказаў: «Вы мне нагадалі нашы 80-я». Вось на колькі мы адсталі ад сусветнага ўзроўню! Але ён не супраць прыехаць у Беларусь і даць майстар-клас.

***— Такая ацэнка не засмуціла?***

— Наадварот, асабіста мне гэта дало штуршок наперад. Цяпер стала зразумела, як развіваць свой гурт. Мае дзяўчаты-студэнткі яшчэ толькі вучацца, але, зарадзіўшыся энергіяй фестывалю, ужо значна прасунуліся наперад, у іх нават змянілася мысленне. Увогуле ўдзел у фестывалі быў для нас вельмі карысным, мы пазнаёміліся з кампазітарам, які піша аранжыроўкі для ансамбля акарын, ён абяцаў падзяліцца з намі некаторымі сваімі творамі.

Пасля ўдзелу ў фестывалі Настасся вывела для сябе «ідэальную формулу»: нам трэба везці за мяжу нашы творы, паказваць свой адметны стыль выканання, але іграць на еўрапейскіх інструментах. А нашых выканаўцаў, наадварот, трэба знаёміць з сусветнымі творамі, каб натхняць іх, пашыраць далягляды.

— І яшчэ хацелася б пажадаць нашым майстрам, каб яны рабілі якасныя інструменты. У нас вельмі мала добрых майстроў, акарыны даводзіцца заказваць за мяжой.

— Справа ў тым, што беларускі майстар — гэта такі крыху зашораны чалавек. Ён можа працаваць 14 гадзін на суткі, рабіць класныя рэчы, але ён сядзіць на адным месцы і нічога навокал не бачыць. Таму вельмі важна нашых майстроў вывозіць на падобныя фестывалі, каб яны адчулі сябе часткай сусветнага працэсу — гэта надае моцы на далейшую творчасць, на новы віток развіцця, — пагаджаецца **кераміст Іван ДАШКОЎ**, які прэзентаваў на фестывалі свае акарыны.

І не толькі іх: у Будрыа майстар апранаў традыцыйны беларускі строй з Магілёўшчыны, чым прыцягваў асаблівую ўвагу гасцей фестывалю.

— Ім падабаўся касцюм, яны падыходзілі і пыталіся, адкуль мы, хто мы такія. Для італьянцаў наш удзел стаў абсалютным адкрыццём Беларусі і беларускіх музыкаў, яны не ведалі, што ў нас увогуле робяць акарыны. Мы выскачылі як чорт з табакеркі, — усміхаецца Іван.

**Вельмі важна нашых майстроў вывозіць на падобныя фестывалі, каб яны адчулі сябе часткай сусветнага працэсу — гэта надае моцы на далейшую творчасць.**

***— А чым адрозніваюцца беларускія акарыны ад, скажам, італьянскіх?***

— У нашай кераміцы замежнікаў зацікавілі традыцыйныя тэхналогіі. Напрыклад, малачэнне — калі вырабы пакрываюцца малаком, награваюцца і дзякуючы гэтаму набываюць адмысловы колер. Ці гартаванне — я лічу, гэта ўвогуле трэба зрабіць беларускім брэндам — калі распалены выраб пры тысячы градусаў дастаецца абцугамі з печы, акунаецца ў кіслую мучную рошчыну, гасіцца ў вадзе — і за імгненне на ім узнікаюць непаўторныя малюнкі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Акарына — старажытны духавы музычны інструмент, гліняная свісткавая флейта. Уяўляе сабой невялікую камеру ў форме яйка з адтулінамі для пальцаў у колькасці ад чатырох да трынаццаці. Шматкамерныя акарыны могуць мець больш адтулін (у залежнасці ад колькасці камер). Звычайна выканана ў кераміцы, але часам вырабляецца таксама з пластыку, драўніны, шкла або металу.

Паводле некаторых ацэнак, інструменты, падобныя да акарыны, з'явіліся прыкладна 12000 гадоў таму. Яны адыгрывалі важную ролю ў культуры Кітая і дакалумбавай Амерыкі. У еўрапейскую культуру акарына ўвайшла ў XIX стагоддзі, калі італьянец Джузэпэ Данаці вынайшаў сучасную форму гэтага інструмента. Назва ўзята з італьянскай мовы, дзе яна азначае «гусяня».

Даволі хутка — у канцы XIX стагоддзя — інструмент прыйшоў у Беларусь. Праўда, у нас ён набыў вядомасць больш як народны, у той час як у Еўропе на акарынах іграюць і класічныя творы, і нават ладзяць канцэрты акарыны з арганам.

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ЦІНЯВІЧ

## СА СПІСА НЕ ВЫКЛЮЧАНА!

У гэтай калісьці неперспектыўнай вёсцы, якая магла быць зусім выключана са спіса населеных пунктаў, я пабываў за некалькі дзён да вышэйзгаданага фестывалю падчас прэс-туру «Новы погляд на агра- і экатурызм» (яго наладзіў праект USAID «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё», які ажыццяўляе праграма развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам спорту і турызму Беларусі).

**«Турыстычная дзейнасць у «Белых лугах» толькі распачынаецца. Вось бы і айчынныя турфірмы падставілі гэтым рупліўцам сваё плячо! Паводле ацэнкі дырэктара адной з мінскіх кампаній, і сапраўды можа атрымацца выдатны турыстычны прадукт».**

Сялянская гаспадарка «Белыя лугі» ў рамках гэтага праекта атрымала кансультатыўную падтрымку (семінары, вывучэнне замежнага вопыту, дапамога экспертаў у распрацоўцы стратэгіі развіцця), а таксама выйграла фінансавы грант (у памеры 15 тысяч долараў) на стварэнне сцэнічнай пляцоўкі, якую і апрабавалі на фестывалі «Талака».

— Гэта ўнікальная для Беларусі ініцыятыва, калі прыватны бізнес узяўся за адраджэнне вёскі. Прычым гэтая ідэя, як бачым, ужо набывае даволі крэатыўныя рысы, — зазначае **каардынатар праекта USAID «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё» па Гродзенскай вобласці Аляксандр ШУХНО.**

...Удзельнікаў прэс-тура сустрэў **кіраўнік сялянскай гаспадаркі «Белыя лугі» Іван РАДЗЮКЕВІЧ**. Ён мінчанін, па спецыяльнасці архітэктар і, дарэчы, сам зрабіў праект сцэнічнай пляцоўкі, удзельнічаў у яе будаўніцтве. А цяпер Іван у пэўным сэнсе і вясковы жыхар — больш знаходзіцца тут, а не ў сталіцы. Яму не толькі вельмі даспадобы тутэйшая прырода, але ёсць і шчырае жаданне зрабіць паспяховым гэты турыстычны праект.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ідэя адраджэння Ціняві́ч і развіцця тут турыстычнай дзейнасці з'явілася ў яго бацькі. **Павел РАДЗЮКЕВІЧ**, бізнесмен з Мінска, даведаўся пра гэтыя цудоўныя прыродныя мясціны, прыехаў сюды і... Вёска была ўжо практычна зусім бязлюдная, і толькі спадкаемцы двух тутэйшых дамоў яшчэ нядаўна прыязджалі, каб нешта пасадзіць на агародзе. Ды і іх на момант прыезду Радзюкевіча не стала, а толькі — занядбанасць і адсутнасць гаспадароў. Некаторыя дамы з-за пустазелля былі практычна нябачныя. Ці патрэбны яны спадчыннікам? Дзе гэтыя людзі? З дапамогай мясцовых улад распачалася складаная праца па кантактах з імі, аднаўленні правоў уласнасці на дамы і зямельныя ўчасткі, афармленні неабходных дакументаў і далейшым продажы сялянскай гаспадарцы. Па некаторых домаўладаннях гэтая праца доўжыцца і сёння.

— Мы вельмі прыязна ставімся да такой ініцыятывы, паколькі гэта інвестыцыі ў развіццё нашай тэрыторыі, ды і эканомія бюджэтных сродкаў, якія б траціліся на знос дамоў, што былі не запатрабаваны, але цяпер паслужаць карыснай справе, — кажа **старшыня Варанчанскага сельскага Савета Сяргей БАРАНАЎ**.

Выгада для тэрыторыі, вядома, яшчэ і ў тым, што дзякуючы новым гаспадарам у Ціня́вічах ужо цяпер працуюць 12 чалавек з навакольных вёсак і суседніх мясцін — на пастаяннай аснове. Яны займаюцца будаўнічымі, сельскагаспадарчымі і іншымі работамі. А калі гаспадарка будзе развівацца, то, пэўна, з'явяцца і іншыя працоўныя месцы.

— Тут вельмі прыемна спаць. Такая цішыня, проста неверагодна. А калі выгляне сонейка і птушкі заспяваюць, дык проста супер, — дзеліцца ўражаннямі Іван Радзюкевіч.

## І АСАЛОДА АД ПРЫРОДЫ, І БІЗНЕС

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже магазина ОАО «Дабрабыт»*, **проводимом 7 июля 2015 г.**

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 06.07.2015 в 12.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Скачко Антонина Владимировна 8(01770) 556-67, 8(029) 692-54-06.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 306-00-59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ООО «Форсолвер» (Организатор аукциона) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом следующих объектов, расположенных на земельном участке, предоставленном на праве постоянного пользования по адресу:

## Гомельская область, г. Ветка, ул. Комсомольская, 2, площадью 2,0517 га с кадастровым номером 320850100013000002:

ОБЪЕКТЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:
- одноэтажное металлическое с двумя кирпичными пристройками здание ткацкого цеха №1 с инвентарным номером 311/С-30576, площадью – 1240,5 кв.м;
- одноэтажное шлакоблочное здание склада химикатов с инвентарным номером 311/С-30578, площадью – 118,8 кв.м;
- двухэтажное кирпичное административное здание, с надворными постройками: беседкой с инвентарным номером 311/С-30581, площадью – 383,5 кв.м;
- двухэтажное кирпичное с кирпичной и шлакоблочной пристройками здание цеха ОТК с надворными постройками: двумя навесами с инвентарным номером 311/С-30582, площадью – 954,3 кв.м;
- одноэтажное кирпичное со шлакоблочной пристройкой здание склада с инвентарным номером 311/С-30584, площадью – 19,6 кв.м;
- одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции с надворными постройками: пятью емкостями с инвентарным номером 311/С-30585, площадью – 41,1 кв.м;
- одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание насосной со складом с инвентарным номером 311/С-30586, площадью – 26,5 кв.м;
- одноэтажное кирпичное с шлакоблочной жилой пристройкой здание красильного цеха с инвентарным номером 311/С-30596, площадью – 595,7 кв.м;
- одноэтажное кирпичное с верандой здание котельной с инвентарным номером 311/С-30597, площадью – 317,4 кв.м;
- сооружение стального центрального отопления протяженностью 444,65 кв.м с тремя колодцами с инвентарным номером 311/С-46243;
- сооружение стальной канализационной системы протяженностью 249,96 кв.м с девятью колодцами с инвентарным номером 311/С-46244;
- сооружение благоустройства, состоящее из асфальтобетонного покрытия площадью 4559 кв.м, железобетонного водоема и железобетонного водоема пожарного с инвентарным номером 311/С-46537;

НЕДВИЖИМЫЕ УЛУЧШЕНИЯ: линия электропередач, два забора железобетонных;

ОБОРУДОВАНИЕ: котел паровой, котел паровой Е 1-9, четыре электродвигателя, химводочистка, три водонагревателя, водонагревательная установка, охладитель, колонка ДА-5, охладитель, подогреватель пароводяной ПП2-9-7-4, насос ВК1/16 (центробежный), насос, насос центробежный, насос КС12/50, насос подпиточный, насосная установка к28/500, дымосос ДН-3, дымосос, вентилятор ЦУ-70, ГРУ (газово-распределительный узел), вентиляционная камера, вентилятор ВЦП-8, лифт грузовой грузоп. 500 кг.

**Начальная цена – 1 367 114 100 бел. рублей с НДС.**
**Шаг аукциона – 5% начальной цены объекта.**
**Задаток – 41 000 000 бел. рублей.**

Аукцион состоится **12 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 10 июня 2015 г. до 16.00** по указанному адресу. Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Форсолвер», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 02.06.2015 г.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об Объекте аукциона размещены на сайте **standard.by.**

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством. Земельный участок имеет ограничения: водоохранная зона водных объектов.

Из задатка, внесенного участником аукциона, и ставшего победителем аукциона или единственным участником, который согласился приобрести Объект аукциона по начальной цене, увеличенной на 5% (далее – Победитель аукциона), Организатором аукциона удерживается вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 2,5% от начальной цены Объекта аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта аукциона; в сроки, согласно заключенному договору купли-продажи, выплатить Продавцу стоимость Объекта аукциона, сформированную по результатам аукциона. Стоимость Объекта аукциона, сформированная по результатам аукциона, не включает в себя вознаграждение Организатора аукциона.

**Тел.: 8 0232 22 48 82,**
**+ 375 29 685 49 86,**
**e-mail: 6854986@standard.by.**

Standard.by®

■ Ведай нашых!

# ПЕЙЗАЖ НА... БЕТОННАЙ СЦЯНЕ

## Як агароджа зернесушыльнага комплексу пераўтварылася ў твор мастацтва

**Рэдка калі сустрэнеш нешта арыгінальнае, што радуе вока, у знешнім выглядзе жылых будынкаў і вытворчых аб'ектаў. А вось у аграгарадку «Доцішкі» Воранаўскага раёна нядаўна з'явілася славутасць, якая прыцягвае зацікаўленыя погляды не толькі мясцовых жыхароў, але і людзей, што праязджаюць міма. На звычайнай бетоннай сцяне зернесушыльнага комплексу мастак з Гродна Андрэй ЛЯНЦЭВІЧ (творчы псеўданім — Арцём Ледзянец) намаляваў пейзаж. Вышыня гэтай «карціны» 2 метры, даўжыня — 120. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з аўтарам і пацікавіўся, як у яго з'явілася гэтая ідэя.**



Андрэй Лянцэвіч малюе з дзяцінства. Ён мастак не дыпламаваны і занятак жывапісам лічыць хутчэй за хобі. Напрыклад, заўсёды мае пры сабе маркер і можа свой малюнак пакінуць на памяць у кавярні альбо на... халадзільніку сяброў. Зрэшты, гэтыя здольнасці Андрэй цяпер ужо выкарыстоўвае і як прафесіянал — зарэгістраваны рамеснікам і займаецца, у тым ліку, мастацкім роспісам кватэр, пад'ездаў, іншых памяшканняў: «Не абавязкова ж толькі шпалеры клеіць альбо фарбаваць сцены адным колерам».

Такая маштабная «карціна», як у аграгарадку «Доцішкі», у творчасці Андрэя Лянцэвіча першая.

— Гэтая ідэя ажыццявілася дзякуючы кіраўніку мясцовага сельгаспрадпрыемства Генадзю Казлоўскаму, да якога мы прыехалі з маім сябрам, кіраўніком будаўнічай фірмы Аляксандрам Пашкелем. Ён выконваў заказы гэтай гаспадаркі, падумалі, што, можа, будзе работа і для мяне. Выйшлі з кабінета старшыні ў калідор, падышлі да акна, і Генадзь Францавіч кажа: «Бачыш гэтую бетонную сценку? Неяк яна страшнавата выглядае. Можаш зрабіць яе прыгожай? Пакажы, на што здольны». Я паглядзеў у інтэрнэце прагноз надвор'я, выбраў тыдзень, каб не спыняцца з-за моцных ападкаў (дробнага дажджу фарба не баіцца) і ўзяўся за працу. За 6 дзён размаляваў гэтую сцяну.

***— Пейзажную тэму заказаў старшыня?***

— Не, ён у мой творчы працэс не ўмешваўся. Часта, калі я маляваў, Генадзь Францавіч праязджаў міма, паглядваў, а потым сказаў, што яму спадабалася, падзякаваў за работу. Зразумела, і прафінансаваў яе.

Мая задума ў тым, што не нейкія абстракцыі, а менавіта пейзаж, сельскія матывы будуць найлепш гарманіраваць з гэтай мясцовасцю. Пшанічнае поле, вёсачка, лес, касцёл... Дарэчы, храм я спачатку маляваў «з галавы», але потым убачыў тутэйшы касцёл і паспрабаваў зрабіць нейкае падабенства з ім. Распачынаў з сярэдзіны сцяны, а потым стаў развіваць «карціну» ў абодва бакі. Увогуле — на 120 метраў, пакуль сцяна не закончылася.

***— А калі б агароджа была, дапусцім, паўкіламетровая?***

— Праблемы не бачу. З палёў і лясоў можна было б перайсці, напрыклад, на горы, вадаспады, з восені — у зіму, з зімы — у вясну...

***— Пэўна, спатрэбілася шмат нейкіх спецыяльных, вельмі дарагіх матэрыялаў?***

— Не, спачатку рабіў грунтоўку гэтай агароджы, каб не засталося вапнавага пакрыцця, а потым фарбаваў. Карыстаўся звычайнай алейнай фарбай лідскай вытворчасці, устойлівай да маразоў і вільгаці. Яе трэба было наносіць тонкім слоем, бо інакш верх высахне, а ўнутраная структура пакрыцця можа патрэскацца і адваліцца. Увогуле мне спатрэбілася 18 кілаграмаў фарбы — найбольш белага і чорнага колеру, а таксама зялёнага, жоўтага, чырвонага, сіняга і карычневага.

***— Яны змешваліся?***

— Вядома, бо калі фарбы не змешваць, то рэалістычнасці не атрымаецца. Таму спачатку мачаеш пэндзаль у адзін колер, іншым канцом — у другі і потым крыху — у трэці.

***— Мясцовыя жыхары да вашай творчасці абыякавымі не засталіся?***

— Яныназіралі за маёй работай як за нейкім цудам. Нават машыны, што праязджалі побач з гэтай агароджай, спыняліся — людзі падыходзілі, дзякавалі, фатаграфавалі.

***— Такі жывапіс можа атрымаць працяг?***

— Чаму не? Убачыўшы, якой стала гэтая сцяна, людзі з суседняга пасёлка заказалі мне ўпрыгожыць пад'езд свайго дома. Мажліва, папрацую і на іншых аб'ектах у СВК «Доцішкі» — напрыклад, на рамонтных майстэрнях. Там, пэўна, больш да месяца ўжо не пейзаж, а нешта, звязанае з тэхнікай. Можа, «усмешка» трактара?

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

**Дарэчы**

Новае аблічча агароджы зернесушыльнага комплексу ў СВК «Доцішкі» ўжо атрымала водгукі ў сацыяльных сетках. Вось некаторыя ўражанні:

— Малайчына! Супер! Прыгажосць!

— Такую б пляцоўку ў нашым пад'ездзе!

— Залатыя рукі. Пабольш бы такіх людзей і ідэй!

■ Кантрамарка

# Як жыць у мяккім свеце, калі ён цвёрды?

**Аднойчы Маргарыт схавалася ад свайго мужа Альберта. Яна залезла ў шафу і праседзела там некалькі гадзін. Яна чула, як Альберт тэлефанаваў спачатку сваякам, потым сябрам, потым — у бальніцы і моргі. Маргарыт сядзела ў шафе і слухала, як Альберт шукае яе. І вось, калі тэлефанаваць больш не было куды, яна падала голас і папрасіла мужа спець чароўную песню, якая вызваліць яе з шафы. Альберт, зразумела, разлаваўся, і Маргарыт давялося выйсці з шафы без усякіх чароўных песень. Яна адамкнула дзверы і замест тлумачэнняў толькі пажартавала, маўляў, як дзіўна арганізавана жанчына: столькі праседзець у шафе ды так і не захацець у прыбіральню... Гэтай вясной у Мінску адбылася прэм'ера спектакля пра каханне, складаныя ўзаемаадносіны і дзіўную арганізацыю свету.**

Рэжысёр Тацццяна Траяновіч разам з тэатральным праектам «Пляцоўка» паставіла ў Цэнтры сучасных мастацтваў п'есу вядомага расійскага драматурга Івана Вырыпаева «Ілюзіі». І тут, з аднаго боку, трэба парадавацца за Цэнтр сучасных мастацтваў, які паступова замацоўвае за сабой рэпутацыю вартай увагі тэатральнай пляцоўкі і аб'ядноўвае самыя цікавыя тэатральныя ініцыятывы. Гэтай вясной там паказалі «Ілюзіі», новую пастаноўку незалежнай тэатральнай групы Laboratory Figures Oskar Schlemmer — перформанс «Я не размаўляю па-шведску», ды некаторыя іншыя работы. Да таго ж ЦСМ сумесна з Цэнтрам беларускай драматургіі арганізаваў праект «Драма Live», у межах якога чытанні п'ес ладзяцца па-за тэатральнай прасторай. Аднак, з іншага боку, узнікаюць і прычыны для хвалявання: ці не ператворыцца ЦСМ у своеасаблівае гета для тэатральнага эксперыменту, які будзе нараджацца і паміраць у яго сценах? Хачу заўважыць, што гэта не крытыка ЦСМ, бо там якраз усё арганізавана належным чынам, а пытанне да нашай тэатральнай супольнасці. Зможа вартая тэатральная ініцыятыва, паказаная ў Цэнтры сучасных мастацтваў, атрымаць неабходную падтрымку і адпаведную ўвагу? Зможа, напрыклад, сцвердзіць сваю ўключанасць у пэўны сегмент тэатральнага працэсу і займець магчымасць намінавацца на тую ж Нацыянальную тэатральную прэмію?

Вартасць і неабходнасць тэатральных эксперыментаў відавочная. Так, «Ілюзіі» — гэта спроба аваладаць адмысловай апавядальнай інтанацыяй, якой вымагае новая драматургія. П'еса Івана Вырыпаева — фактычна празаічны тэкст, рытмізаваная проза, падзеленая на ўрыўкі для чатырох выканаўцаў: дзвюх жанчын і двух мужчын. Драматург распавядае гісторыі кахання дзвюх сямейных пар, што жылі побач. Аповед вядзецца не лінейна: узрост герояў імкліва змяняецца — вось толькі-толькі ім было за восемдзесят, а праз хвіліну — ужо каля трыццаці. Аднак куды складаней прасачыць за тым, хто як ставіўся ў пэўны перыяд да іншага ў чатырохкутніку «Дэні—Сандра—Альберт—Маргарыт». Нязменна адно: бліжэй да апошніх хвілін жыцця кожны з іх сумняваецца ў сваім каханні...

Увасабляць тэксты Івана Вырыпаева на сцэне няпроста, бо яны вымагаюць ад акцёра нязвыклага спосабу існавання. Драматург стварае п'есу такім чынам, што ад акцёраў патрабуецца забіць у сабе персанажа і знайсці выканаўцу. То бок не пераўвасабляцца, не іграць, а проста распавядаць чужую гісторыю, якая цябе ўсхвалявала. Рэжысёр Тацццяна Траяновіч падпарадкоўвае дзеянне гэтай асаблівай тэкстацэнтрычнасці. Акцёры, занятыя ў спектаклі (Марына Дзянісава, Антон Макуха, Алеся Пухавая ды Станіслаў Савосцін), спраўляюцца з гэтым па-рознаму. Больш пераканаўча выглядаюць выканаўцы-мужчыны, асабліва Антон Макуха, іранічная інтанацыя якога не дазваляе наблізіцца ні да каго з чатырох герояў п'есы. Выканаўцы-жанчыны, апавядаючы свае фрагменты, часам пераходзяць мяжу, за якой Алеся Пухавая не проста расказвае нам пра Маргарыт, а становіцца ёю. Але ж тэкст напісаны так, што выканаўцам даводзіцца гаварыць пра ўсіх герояў адначасова, а не ад імя аднаго. Атаясамленне з нейкім канкрэтным разбурае ўнікальную вырыпаеўскую манеру апавядання. Аднак некалькі вясновых паказаў зрабілі заўважным, як ад спектакля да спектакля акцёры ўсё дакладней яе адчуваюць і перадаюць.

Адной з асаблівасцей гэтай манеры з'яўляецца рытмічнасць, музычнасць тэксту, якую рэжысёр выяўляе і падкрэслівае тым, што ўводзіць у спектакль яшчэ аднаго героя — музыку Арцёма Давідовіча. Увесь спектакль суправаджаецца жывым гукам, калі кампазітар і ён жа выканаўца скіроўвае дзеянне, падкрэслівае рытм тэксту гітарнымі імправізацыямі.

Яшчэ адна асаблівасць спектакля — сцэнаграфія. Акцёры з'яўляюцца перад гледачом у паўсядзённай вопратцы, падкрэсліваюць сваю звычайнасць: такое магло адбыцца дзе заўгодна і з кім заўгодна. Выканаўцы дзейнічаюць у пустой прасторы, аздобленай некалькімі



Фота Крысціны ГРЭКАВАЙ.

крэсламі і функцыянальнай сцяной, на якой падчас спектакля з'яўляюцца схемы, што дапамагаюць гледачам разабрацца ў перапетыях адносін і кранальныя малюнкі-ілюстрацыі (аўтар Алена Сілуціна). Гэта ўвогуле адметнасць «Ілюзій» — у пустым пакоі перад гледачом усё ўзнікае з нічога і ў нішто знікае, пакідаючы напрыканцы перад вачыма зорнае неба з літар (відэашэраг Алесі Давідовіч), гледзячы на якое, пайшоў з жыцця апошні ўдзельнік гэтай заблытанай гісторыі пра каханне Дэні...

Так, «Ілюзіі» — гэта найперш гісторыя пра каханне і яго ілюзорнасць: як так адбываецца, што, пражыўшы з чалавекам паўстагоддзя, ты раптам пачынаеш сумнявацца і замест таго, каб сказаць «Я кахаю цябе!», кажаш «Дарагая, мне здаецца, што я кахаю Сандру». Але адной з самых важных сцэн гэтай п'есы мне падаецца гісторыя пра тое, як Альберт распавядаў студэнтам пра карабельныя канаты і, згадаўшы, што ў іх вытворчасці выкарыстоўваюць каноплі, атрымаў ад студэнта прапанову пакурыць травы. На дзіва студэнту — пагадзіўся. І вось ён пакурыў, а літаральна праз некалькі хвілін зразумеў, што свет, у якім мы жывём, насамрэч мяккі. Альберт мацаў яго рукамі і плакаў, бо гэта дзіўна і надзвычай тужліва, тое, што мы не заўважаем мяккасці свету ды жывём у цвёрдым. І гэтая метафара мяккасці і цвёрдасці выяўляе перспектыву: увесь свет — ілюзія. Ды пакідае пытанне: як тут жыць?

Мы мусім намагацца пабачыць свет такім, які ён ёсць. Спектакль «Ілюзіі», які паставіла Тацццяна Траяновіч, чарговы раз пераконвае нас: у беларускім тэатральным свеце ёсць вартыя тэатральныя ініцыятывы. Але што стане з імі ў няпростым ілюзорным (мяккім ці цвёрдым для іх) свеце?

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

# ОАО «Нафтан»

## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

| Наименование | Инв. № | Год приобретения | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| Аппарат пескоструйный BASIC QUATTRO | 06253318 | 2008 | **6 720 000** |
| Триммер для гипса MT PLUS | 06253319 | 2008 | **5 040 000** |
| Смеситель вакуумный стоматологический MOTOVA 100 | 06253330 | 2008 | **6 480 000** |
| Аппарат пароструйный TRITON SLA | 06253331 | 2008 | **15 840 000** |
| Аппарат пескоструйный DUOSTAR PLUS | 06253332 | 2008 | **16 560 000** |
| Установка стоматологическая SIRONA C8 | 06253436 | 2009 | **126 000 000** |
| Установка стоматологическая SIRONA C8 | 06253437 | 2009 | **134 400 000** |
| Аппарат фрезерный/ PARASKOP M | 06253440 | 2009 | **36 000 000** |
| Аппарат пескоструйный/ BASIC QUATTRO | 06253442 | 2009 | **9 600 000** |
| Аппарат пескоструйный/ VARIO BASIC | 06253443 | 2009 | **7 320 000** |
| Агрегат фрезеровальный/ PARAMIL 3 | 06253444 | 2009 | **18 960 000** |
| Печь для литья сплавов/ NAUTILUS CC plus | 06253449 | 2009 | **94 800 000** |
| Печь для литья сплавов/ FORNAX T | 06253450 | 2009 | **42 360 000** |
| Мотор лабораторный стоматологический/ Л5 plus EWL 4911 | 06253451 | 2009 | **9 600 000** |
| Компрессор для установок стоматологических двухагрегатный QUATTRO | 06253452 | 2009 | **44 160 000** |
| Компрессор для установок стоматологических двухагрегатный QUATTRO | 06253453 | 2009 | **44 160 000** |
| Камера интраорльная Vistacam CL | 06253454 | 2009 | **28 800 000** |
| Камера интраорльная Vistacam CL | 06253455 | 2009 | **28 800 000** |
| Камера интраорльная Vistacam CL | 06253456 | 2009 | **28 800 000** |
| Лампа для фотополимеризации Bluephase | 06253457 | 2009 | **6 600 000** |
| Лампа для фотополимеризации Bluephase | 06253458 | 2009 | **6 120 000** |
| Смеситель вакуумный стоматологический/ MOTOVA 100 | 06253466 | 2009 | **9 240 000** |
| Смеситель вакуумный стоматологический/ MOTOVA 100 | 06253467 | 2009 | **9 240 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253482 | 2009 | **11 400 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253483 | 2009 | **11 400 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253484 | 2009 | **11 400 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253485 | 2009 | **11 400 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253486 | 2009 | **11 400 000** |
| Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941 | 06253487 | 2009 | **11 400 000** |
| Оборудование стоматологическое лабораторное/ PROGRAMAT P500 | 06253527 | 2009 | **31 560 000** |
| Оборудование стоматологическое лабораторное/ PROGRAMAT P500 | 06253528 | 2009 | **31 560 000** |
| Аппарат для лазерной сварки/ LASERSTAR Tplus | 06253533 | 2009 | **136 800 000** |
| Аппарат для дублирования/ GELOVIT 200 | 06253534 | 2009 | **21 600 000** |
| Прибор для измерения глубины поднутрений/ PARAMETER | 06253535 | 2009 | **2 880 000** |
| Система сжатого воздуха и вакуума | 06253539 | 2009 | **165 600 000** |
| Вибростолик(смеситель) Vibraflex2 | 06273503 | 2009 | **3 240 000** |
| Вибростолик(смеситель) Vibraflex2 | 06273504 | 2009 | **3 240 000** |
| Вибростолик(смеситель) Vibraflex2 | 06273505 | 2009 | **3 240 000** |
| Кастрюля для полимеризации пластмассы/POLYCLAV/ | 06273529 | 2009 | **4 800 000** |
| Кастрюля для полимеризации пластмассы/POLYCLAV/ | 06273530 | 2009 | **4 800 000** |
| Камера для диагности кариеса Vistaproof | 06273531 | 2009 | **25 440 000** |
| Аппарат пароструйный/ TRITON SLA | 06273546 | 2009 | **28 080 000** |
| Камера интраорльная Vistacam CL | 06276052 | 2009 | **24 840 000** |
| Печь световая Lumamat 100 | 06280381 | 2012 | **48 360 000** |

**Состояние удовлетворительное.**
**Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 2 июля 2015 года с пометкой на конверте «Реализация неликвидов. Медтехника».**
**Извещения на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, 8 (033) 398 07 67.**

УНП 300042199

# Извещение об открытом аукционе 2 июля 2015 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех» |
|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** | **4** |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2 |
| **Продавец объекта** | **ТОРГОВОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «ПриБут»** | | | |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| **Площадь земельного участка для обслуживания 2-х совмещенных изолированных помещений, га** | 1,444 | | 3,574 | |
| **Общая площадь помещения (м²)** | 3982,2 | 4516,7 | 12954,0 | 3351,5 |
| **Начальная цена (бел.рублей)** | 5 909 397 192 | 6 699 182 623 | 36 499 021 758 | 4 117 042 389 |
| **Сумма задатка (бел. рублей)** | 590 939 719 | 669 918 262 | 3 649 902 176 | 411 704 239 |
| **Условия продажи** | Рассрочка платежа до 3-х лет | Рассрочка платежа до 3-х лет | Рассрочка платежа до 3-х лет | Рассрочка платежа до 3-х лет |
| **Характеристика объекта** | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый, пролеты оборудованы кран-балками г/п 3тн. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый, пролеты оборудованы кран-балками г/п 5тн. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. | Одно и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м², сушильные камеры 6 шт., навес 72 м², циклоны 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, кран-балка г/п 3,5тн., асфальто-бетонное и бетонное покрытие 4979 м², электрический кабель 96,7 м, ливневая и фекальная канализация 203,8 м. Ввод в эксплуатацию 1972 г. | Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальтобетонное покрытие 1876 м², бетонное покрытие 2751 м², линия электропередач (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, водогрейный котел 4МВТ, кран-балка г/п 3,5тн., ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию 1972 г. |
| **Организатор аукциона** | | **Открытое акционерное общество «Пинский комбинат строительной индустрии»** | | |

**Аукцион состоится 2 июля 2015 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. *Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет: Унитарное предприятие «ПриБут» р/счет 3012156959005 в ОАО «Белвнешэкономбанк» в г. Пинске, код 153001226, УНП 291190544, срок внесения суммы задатка* – **по 1 июля 2015 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 1 июля 2015 года включительно, тел. 80165-37-17-06, тел./факс (80165) 37-16-66, конт. тел. 375-29-964-26-37, ksi – pinsk@mail.ru**

ДОПОЛНЕНИЕ К ГОДОВОМУ ОТЧЕТУ ЭМИТЕНТА

# Открытое акционерное общество «БЕЛФА» г. Жлобин

Проезд Красный, 2, г. Жлобин, Гомельская область, 247210, Республика Беларусь, УНП 400076540

## ГОДОВОЙ БАЛАНС ОАО «БЕЛФА» на 01.01.2015 г.

млн руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 177554 | 183222 |
| Нематериальные активы | 120 | 95 | 101 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 6033 | 899 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 27 | 27 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 2 | 2 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **183711** | **184251** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 71988 | 61727 |
| В том числе: материалы | 211 | 23675 | 23343 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 1154 | 1117 |
| готовая продукция и товары | 214 | 47159 | 37267 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 108 | 811 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 36 | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 16763 | 19704 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 97 | 3253 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **88992** | **85495** |
| **БАЛАНС** | **300** | **272703** | **269746** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 136859 | 136859 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 87694 | 87914 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 25419 | 25788 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **249972** | **250561** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | 55 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **55** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 14490 | 6917 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 8209 | 10487 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 2631 | 3709 |
| по авансам полученным | 632 | 1143 | 3409 |
| по налогам и сборам | 633 | 1801 | 975 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 302 | 510 |
| по оплате труда | 635 | 1600 | 1261 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 49 | 35 |
| прочим кредиторам | 638 | 683 | 588 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | 1714 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 32 | 12 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **22731** | **19130** |
| **БАЛАНС** | **700** | **272703** | **269746** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «БЕЛФА» за 2014 год.

млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2014 года | За январь-декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 211978 | 253710 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 168559 | 199296 |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 43419 | 54414 |
| Управленческие расходы | 040 | 25393 | 26213 |
| Расходы на реализацию | 050 | 3008 | 4435 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 15018 | 23766 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 88479 | 120898 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 98271 | 130453 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 5226 | 14211 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4557 | 195 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 4512 | 138 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 22 | 57 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 23 | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 856 | 174 |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 856 | 174 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 3045 | 2036 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 3045 | 2036 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 7927 | 7025 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | 6228 | 6096 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 1699 | 929 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | (1181) | (4968) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 4045 | 9243 |
| Налог на прибыль | 160 | 2072 | 2830 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 55 | 8 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | 14 | 11 |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 2014 | 6410 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | (193) | 31998 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | (27) | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 1794 | 38408 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 736 | 2342 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Генеральный директор С.В. Циркунов

Главный бухгалтер Е.В. Иванченко

■ Спорт-тайм

# ПРАЙГРАЦЬ МАТЧ... СУДДЗІ

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра новага лідара ў спісе найлепшых бамбардзіраў чэмпіянату краіны па футболе, апошні матч Жэлькі Бабіча ў Беларусі і драматычную сустрэчу Вікторыі Азаранкі і Сірэны Уільямс на кортах Парыжа.**

1. **У 8-м туры чэмпіянату Беларусі па футболе** «Славія» разграміла брэсцкае «Дынама» (3:0) і замацавалася ў сярэдзіне турнірнай табліцы. Героем матча стаў 23-гадовы форвард мазыран Дзяніс Лапцеў, які забіў два мячы і абагнаў мінскага дынамаўца Фатаса Бечырая ў гонцы за званне найлепшага бамбардзіра чэмпіянату. На рахунку Лапцева — 6 забітых мячоў, у Бечырая — 5.

Бечырай, дарэчы, у чарговы раз дапамог сваёй камандзе здабыць вельмі важную перамогу. У матчы супраць «Нафтана» (2:1) чарнагорац не забіваў, але ў аўтарстве галоў усё ж такі паўдзельнічаў. Бечырай аддаў два пасы на Ненада Адамавіча, якія былі рэалізаваны.

У сваю чаргу лідар турніру БАТЭ на класе перайграў «Мінск» (1:0). Адзіны гол у матчы забіў Міхаіл Гардзейчук.

**Астатнія вынікі 8-га тура:** «Нёман» — «Граніт» — 2:0, «Шахцёр» — «Тарпеда-БелАЗ» — 3:1, «Гомель» — «Віцебск» 2:0, «Белшына» — «Слуцк» — 2:0.

2. **БГК імя Мяшкова ў сёмы раз стаў чэмпіёнам краіны.** У першым фінальным матчы гандбольнага чэмпіянату перамогу атрымаў мінскі СКА (33:24). Але на сваёй тэрыторыі «мяшкоўцы» узялі рэванш (29:26) і параўналі лік у серыі. Вырашальны матч быў сапраўднай бітвай двух роўных сапернікаў. Лёс тытула вырашыла серыя сяміметровых удараў. У гэтай гандбольнай латарэі мацнейшымі былі брастаўчане (4:2), якія з агульным лікам у матчы 30:28 атрымалі выніковую перамогу.

Дарэчы, гэта быў апошні матч Жэлькі Бабіча на пасадзе галоўнага трэнера БГК. Новым трэнерам брастаўчан стане Сяргей Бябешка. Адзначым, што цяпер харвацкі спецыяліст будзе ўзначальваць нацыянальную зборную сваёй краіны.

3. **Вікторыя Азаранка ў драматычным матчы 3-га раўнда «Ралан Гарос» саступіла** першай ракетцы свету Сірэне Уільямс — 6:3 4:6 2:6. Беларуская тэнісістка з самага старту пачала дыктаваць умовы на пляцоўцы і павяла ў ліку 6:3 4:2. Але потым амерыканка відавочна палепшыла якасць сваёй гульні і навязала Вікторыі сур'ёзную барацьбу. Канцоўку другога сэта азмрочыў эпізод пры ліку 6:3 4:5 40:40. Лінейны суддзя памыліўся, палічыўшы аўт пасля ўдару беларускай тэнісісткі, Уільямс адбіла мяч у сетку. Але арбітр на вышыні палічыў правільным перайграць ачко, а не аддаць яго Вікторыі...



У такой сітуацыі толькі і заставалася разводзіць рукамі...

У вырашальным сэце беларуская тэнісістка павяла 2:0, але пасля прайграла 6 геймаў запар. Пасля матча Азаранка так пракаментавала спрэчны эпізод у канцоўцы другой партыі: «Дрэнна, што ў тэнісе няма паўтораў для суддзяў, як у футболе ці баскетболе. Я не кажу, што праз гэта ачко я прайграла матч. Але ў такія моманты, калі ў цябе няма паўтору, гэта сапраўды выклікае шмат праблем. Хаця ў тым выпадку ўсё было занадта відавочна...»

4. **Беларускія грацыі ўдала выступілі** на этапе Гран-пры ў Берліне. Меліціна Станюта стала другой у шматбор'і, а ў фінале асобных відаў заваявала тры «бронзы» і адно «золата» (у практыкаванні са стужкай)! Дзве «бронзы» заваявала і Кацярына Галкіна — у практыкаваннях са стужкай і з булавамі.

Акрамя гэтага, беларускія «групавічкі» сталі чэмпіёнкамі ў шматбор'і і фінале практыкавання з пяццю стужкамі, а таксама сярэбранымі прызёрамі ў практыкаванні з булавамі і абручамі. Віншуем нашых грацый!

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■ Супраць тытуню

# ДАРАГА? ТРЭБА ЯШЧЭ ДАРАЖЭЙ!

## Бяспечных цыгарэт, як і бяспечнага ўзроўню іх ужывання, не існуе

**Штогод ад «тытунёвай эпідэміі» ў свеце гіне каля 6 млн чалавек (звыш 600 тысяч з іх з'яўляюцца «пасіўнымі» курцамі — церпяць ад уздзеяння дыму). У сусветным маштабе курэнне пагражае больш, чым туберкулёз, мацярынская смяротнасць, дарожна-транспартныя здарэнні, самагубствы і забойствы разам узятыя.**



### НЕЗАКОННА ВЫВОЗІМ

Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае сёлета спыніць незаконны гандаль тытунёвымі вырабамі. Паводле даных даследаванняў, уключаючы інфармацыю мытных органаў, на долю незаконнага рынку тытунёвай прадукцыі ў Еўропе можа прыпадаць амаль кожная дзясятая цыгарэта. Звязаныя з гэтым мытныя і падатковыя страты ў еўрапейскім рэгіёне перавышаюць 10 млрд еўра за год. У Беларусі ў студзені—сакавіку гэтага года пачаты адміністрацыйны працэс па 123 справах аб адміністрацыйных парушэннях, канфіскавана каля 22,5 млн штук цыгарэт. Фактычна ўсе гэтыя выпадкі звязаны са спробамі вывазу, што абумоўлена нізкім коштам такой прадукцыі ў параўнанні з суседнімі краінамі.

Паводле слоў **кіраўніка краінавага бюро СААЗ у Рэспубліцы Беларусь Ягора ЗАЙЦАВА**, Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае Беларусь ратыфікаваць Пратакол аб ліквідацыі незаконнага гандлю тытунёвымі вырабамі (прадугледжвае меры па кантролі паставак, узмацненне правапрымянення і ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва). Удзел усіх краін у гэтай справе ўяўляецца надзвычай важным — найперш таму, што тытунь адбірае жыццё 1,6 млн жыхароў еўрапейскага рэгіёна, дзе захоўваецца самы высокі ў свеце ўзровень курэння тытуню сярод дарослых.

Прадстаўнікі тытунёвай індустрыі сцвярджаюць, што высокія падаткі правакуюць кантрабанду, і ім часам удаецца такім чынам пераконваць урады не павышаць падаткаў на тытунёвыя вырабы. На самой справе агульны маштаб кантрабанды ў цэлым вышэйшы ў тых краінах, дзе цэны на цыгарэты ніжэйшыя. Высокія падаткі могуць напачатку правакаваць кантрабанду, аднак гэта не адзіны фактар (уплывае верагоднасць раскрыцця злачынстваў, цяжар пакарання, узровень карупцыі і інш.).

### НЯМА АБАРОНЫ?

На жаль, у нас усё яшчэ не прыняты закон аб абароне здароўя насельніцтва ад наступстваў ужывання тытуню і ўздзеяння тытунёвага дыму, а ён адлюстроўваў бы некалькі важных момантаў: узмацненне падатковай палітыкі і адпаведнае павышэнне цэн на цыгарэты, стварэнне бяздымнага асяроддзя ў закрытых памяшканнях, забарону рэкламы і спонсарства (тут у нас ужо ёсць чым ганарыцца), далейшае ўкараненне практыкі папярэджванняў аб наступствах курэння, прадастаўленне даступнай дапамогі тым, хто хоча кінуць курыць.

• За апошнія дзесяць гадоў аб'ём паставак імпартных цыгарэт у Беларусь зменшыўся ў 4,5 раза.

• Аб'ём вытворчасці тытунёвых вырабаў летась застаўся такім, як у 2013 годзе — 34,8 млрд штук (у 2005-м — 12 млрд штук).

• Па даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, доля курцоў ва ўзросце пасля 16 гадоў складае 25% (гэта найменшая колькасць з 2000 года). Доля мужчын пры гэтым зніжаецца, а жанчын расце. Самы нізкі ўзровень курцоў-дарослых сярод еўракраін — у Швецыі (11%), Вялікабрытаніі і Ісландыі (14%).

### СТРАШНЫ МАЛЮНАК

У маі наступнага года ўступіць у сілу «Тэхнічны рэгламент на тытунёвую прадукцыю Мытнага саюза», дзе вызначаны шэраг новых патрабаванняў. Так, на момант уступлення ў сілу прынятага бакамі дакумента ўпакоўка цыгарэт павінна змяшчаць выяву наступстваў ужывання тытуню (біблітэку карцінак распрацоўваў казахстанскі бок, і гэта ўзгоднена з іншымі краінамі Мытнага саюза) і надпісы-папярэджанні на рускай мове і мове вытворцы. Усё гэта павінна займаць палову плошчы абодвух бакоў пачкі. «Знікнуць колькасныя паказчыкі шкодных рэчываў — будзе пазначана толькі, што выраб змяшчае ніка-цін, канцэрагены і мутагены, — тлумачыць **загадчыца аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга БАРТМАН.** — Гэта робіцца для таго, каб спажывец не суцяшаў сябе, што ёсць цыгарэты «больш ці менш шкодныя». Аднак тытунёвыя кампаніі павінны будуць падаваць у органы аховы здароўя справаздачу аб саставе тытунёвых вырабаў».

### ПРЭЧ З ВАЧЭЙ

З 48 тысяч розначных гандлёвых аб'ектаў 12 тысяч прадаюць тытунёвыя вырабы. 65 працэнтаў усіх магазінаў па краіне рэалізуюць цыгарэты. Летась гэта рэалізацыя скарацілася ў параўнанні з папярэднім годам на 10%.

— Розначныя гандлёвыя аб'екты павінны прадугледжваць у асартыментных пераліках ад 7 да 60 найменняў разнавіднасцяў тытунёвых вырабаў, — паведамляе **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і паслуг Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь Віялета БРАЗОЎСКАЯ.** — Неўзабаве, ужо з 1 ліпеня, чакаецца шэраг змен у галіне продажу. Уводзіцца забарона на аптовы гандаль і захаванне такой прадукцыі індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Устанаўліваюцца новыя патрабаванні да юрыдычных асоб, якія маюць права ажыццяўляць гандаль тытунёвымі вырабамі, новыя ліцэнзійныя патрабаванні да аптовага гандлю. Усе гандлёвыя ўстановы гатовыя да таго, што замест выкладкі такога тавару спажыўцу будзе прапанаваны пералік усіх вырабаў, якія ёсць у продажы, у алфавітным парадку: спачатку рускамоўныя, пасля англамоўныя, без графічных выяў і малюнкаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Вольны час

# ДЭГУСТАТАР НА ДЗЕНЬ

## 20 чэрвеня пройдзе Трэці сырны фестываль

**Пляцоўкай збору аматараў малочнай прадукцыі стане мінскі Цэнтральны батанічны сад (у папярэднія гады фестываль праводзіўся ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і быту ў Азярцы), дзе ў гэты час будуць квітнець ружы і цюльпаннае дрэва. Сярод прадпрыемстваў, што прадставяць сваю прадукцыю на суд спажыўца, — Кобрынскі масларобны-сыраробны завод, Слуцкі сыраробны камбінат, Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат, Пружанскі малочны камбінат і іншыя вытворцы.**

— У кожнага брэнда свая фішка: адны прывабліваюць асартыментам, іншыя — якасцю, а хтосьці робіць стаўку на арыгінальнасць, — гаворыць **генеральны дырэктар цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» Анатоль АКАНЦІНАЎ.** — Адметна, што беларускія вытворцы выпускаюць натуральныя сыры. На тым жа расійскім рынку, напрыклад, у крызіс з'явіўся сырны прадукт, які, зразумела, саступае па якасці, але на працэнтаў 30 таннейшы, таму гіпермаркеты пераключыліся на яго.

На майстар-класах ад вядомых кулінараў наведвальнікаў навучаць сакрэтам прыгатавання сырных страў. Усім ахвотным прапануюць паўдзельнічаць у народнай дэгустацыі і вызначыць найлепшы сыр. Так, летась «каралём фестывалю» выбралі сыр з цвіллю ад маладзечанскіх «малочнікаў». Дарэчы, сёлета мерапрыемствам зацікавілася Гільдыя кухараў. Для вытворцаў гэта добрая магчымасць пазнаёміць са сваім асартыментам рэстараны, большасць з якіх пакуль што працуе з імпартнымі прадуктамі.

**Галоўны рэдактар часопіса «Продукт. BY» Андрэй КІРЫЕНКА** упэўнены, што фестываль дазволіць прыцягнуць аптовых спажыўцоў, у тым ліку і замежных:

— Па выніках мінулых фестываляў сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання мы выдалі каталогі «Беларусь сыраробная» і «Беларусь малочная», дзе прадстаўлена гісторыя нашай малочнай прамысловасці, інфармацыя пра вытворцаў. Сёлета мы арганізуем яшчэ і дзелавы форум, дзе будуць абмяркоўвацца новыя магчымасці для экспарту. Напрыклад, прэзентуюць тэхналогію разліву малака ў шасціслаёвую пластыкавую бутэльку, якая дазволіць прадаваць у той жа Кітай звычайнае вадкае малако, а не сухое (на ім не заробіш, бо складана канкураваць з Новай Зеландыяй і Аўстраліяй, дзе сабекошт прадукцыі ніжэйшы).

Увогуле, падобныя фестывалі могуць зацікавіць не толькі бізнесменаў, але і простых турыстаў, якіх арыгінальныя і маштабныя мерапрыемствы прываблівають не менш, чым архітэктура ці прырода. Па словах Анатоля Аканцінава, калі вывучаеш суседнія рынкі, выразна бачыш спецыялізацыю: Польшча — музычныя фестывалі, Прыбалтыка — гістарычная спадчына.

— Беларусь магла б пазіцыянаваць сябе як малочная краіна, — лічыць ён. — У прынцыпе падзейны турызм — перспектыўны напрамак. І ў нас праводзіцца шмат мясцовых фестываляў, але яны не дацягваюць да належнага ўзроўню. З аднаго боку, нашы прадпрыемствы не настолькі багатыя, каб ладзіць маштабныя мерапрыемствы, з другога — бізнес чамусьці не бачыць у гэтым перспектывы.

На сёлетні сырны фестываль арганізатары чакаюць каля пяці тысяч наведвальнікаў, на дзве тысячы больш, чым у папярэднія гады. Кошт квіткоў — 80 тысяч (для школьнікаў, студэнтаў і пенсіянераў прадугледжана 50-працэнтная зніжка, для асобных катэгорый, напрыклад, шматдзетных сем'яў, уваход будзе бясплатным).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**



# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЧЭРВЕНЬ

**2 чэрвеня, аўторак.** Абавязкова падстрыжыце валасы ў гэты дзень, каб зрабіць сваё жыццё больш яркім і цікавым.

**3 чэрвеня, серада.** Прычоска, зробленая сёння, будзе мець чароўныя ўласцівасці. Стрыжка, укладка ці афарбоўка прынясе ўдачу ў асабістым жыцці.

**4 чэрвеня, чацвер.** Гэта выдатны дзень для стрыжкі валасоў, новая стрыжка прыняссе здароўе вашым валасам і прывабнасць вам.

**5 чэрвеня, пятніца.** Добры дзень для стрыжкі валасоў і наогул догляду за сваёй знешнасцю.

**6 чэрвеня, субота.** Дзень вельмі неспрыяльны для стрыжкі, афарбоўвання і іншых цырульніцкіх працэдур.

**7 чэрвеня, нядзеля.** Добры час для правядзення нестандартных стрыжак.

**8 чэрвеня, панядзелак.** Ад стрыжкі валасоў варта ўстрымацца.

**9 чэрвеня, аўторак.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі і догляду за валасамі. Можа з'явіцца перхаць.

**10 чэрвеня, серада.** Стрыжка ў гэты дзень паскарае рост валасоў, але са стратай іх якасці.

**11 чэрвеня, чацвер.** Дзень неспрыяльны для стрыжкі, але добры для правядзення эпіляцыі.

**12 чэрвеня, пятніца.** Спрыяльны для стрыжкі дзень, якая прывядзе да аднаўлення пашкоджаных валасоў.

**13 чэрвеня, субота.** Стрыжка валасоў і новая прычоска будуць вам вельмі да твару і паспрыяюць узмацненню асабістага абаяння, поспеху ў navakolnyx.

**14 чэрвеня, нядзеля.** Гэты дзень для стрыжкі абсалютна нейтральны, ні на што не будзе ўплываць.

**15 чэрвеня, панядзелак.** Сёння выдатны дзень для стрыжкі і афарбоўвання. Вітаюцца смелыя эксперыменты, стварэнне лёгкіх паветраных прычосак, меліраванне і афарбоўванне.

**16 чэрвеня, аўторак.** Вельмі неспрыяльны для стрыжкі дзень — занадта вялікая рызыка прыцягнуць пагрозу сустрэчы з сур'ёзным няшчасцем.

**17 чэрвеня, серада.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, афарбоўкі і завіўкі валасоў. Калі пастрыгчы валасы ў гэты дзень, яны стануць непаслухмянымі і калматымі, стрыжцы не ўдасца надаць патрэбны выгляд, прычоска атрымаецца бясформеннай.

**18 чэрвеня, чацвер.** Сёння яшчэ адзін непадыходзячы дзень для стрыжкі, ад афарбоўвання таксама лепш устрымацца.

**19 чэрвеня, пятніца.** Стрыжка ў гэты дзень зробіць валасы больш густымі і ўмацуе іх.

**20 чэрвеня, субота.** Стрыжка паспрыяе таму, што вашы валасы будуць менш секчыся.

**21 чэрвеня, нядзеля.** Спрыяльны дзень для наведвання салона. У гэты перыяд паляпшаецца структура і паскараецца рост валасоў.

**22 чэрвеня, панядзелак.** Добры час для наведвання цырульніка. Пры стрыжцы ў гэты перыяд валасы добра растуць, умацоўваюцца, набываюць устойлівасць да знешніх уздзеянняў, менш сякуцца.

**23 чэрвеня, аўторак.** Сёння цалкам прыдатны дзень для візіту ў цырульны салон, можна стрыгчы і афарбоўваць валасы, рабіць лячэбныя працэдуры і пажыўныя маскі.

**24 чэрвеня, серада.** Устрымайцеся ад стрыжкі, бо могуць здарыцца непрыемнасці са здароўем.

**25 чэрвеня, чацвер.** Стрыжка ў гэты дзень не зменіць структуры і якасці вашых валасоў, але яны будуць хутчэй расці.

**26 чэрвеня, пятніца.** Стрыжка валасоў проціпаказана — можа прывесці да непрыемнасцяў і напасцяў.

**27 чэрвеня, субота.** Стрыжка зробіць валасы непаслухмянымі. Але тым, хто хоча, каб валасы пасля яе мелі схільнасць да завівання, гэта можа быць і на карысць.

**28 чэрвеня, нядзеля.** Стрыжка актывізуе вашу асабістую энергетыку і ўзмоцніць харызму.

**29 чэрвеня, панядзелак**. Стрыжка прынясе шчасце і ўпэўненасць у сабе.

**30 чэрвеня, аўторак.** Стрыжка паказана для стымулявання аптымізму.

## Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

**Б**лізняты (двойня). У народных уяўленнях да нараджэння адразу дваіх дзяцей ставіліся насцярожана. Разам з тым на Палессі лічылі, што нараджэнне блізнят (таксама як і нараджэнне блізнят-жывёл) прыносіць поспех і прыбытак у гаспадарку.

◈ Можа быць, неадназначнае стаўленне да нараджэння блізнят нашы продкі суадносілі з адмоўнай семантыкай слова «два». Блізнят параўноўвалі з такімі «падвоенымі» катэгорыямі як дзень-ноч, дабро-зло, неба-зямля, святло-цемра: адзін з паказчыкаў абавязкова павінен быў саступіць, а другі — перамагчы.

◈ Нашы продкі верылі ў тое, што ў блізнят адзін лёс на дваіх, адна душа і адзін анёл-ахоўнік, а гэта значыць, што ім няпроста будзе кроччыць па жыцці.

◈ Перакананасць у агульным лёсе і ў адной душы блізнят знайшла адбітак у забароне хрысціць і вянчаць такіх дзетак у адзін дзень. Па некаторых звестках, хрысціць першым трэба было таго, хто нарадзіўся другім, каб гэтым «выправіць» яго долю. Па іншых звестках, першым хрысцілі таго, хто нарадзіўся першым, каб «не пярэчыць» найвышэйшым сілам, якія і абумовілі нараджэнне двойні.

◈ Звычайна блізнятам давалі сугучныя (падобныя) імёны.

◈ Лічылася, што смерць аднаго з блізнят абавязкова пацягне за сабой другога. Таму выконвалі абрад так званага «раздваення»: на парозе хаты сякерай «раздвойвалі» манету, адну палову якой кідалі ў магілу памерламу, а другую пакідалі ў хаце — хавалі за абразам у чырвоным куце.

◈ У некаторых выпадках людзі былі рады таму, што сярод аднавяскоўцаў ёсць блізняты. Так, для захавання вёскі ад эпідэміі ў паўночна-заходняй частцы Беларусі і на Палессі праводзілі абрад «абворвання вёскі», які выконвалі браты-блізняты з дапамогай валоў-блізнят.

◈ Лічылася, што жанчыны, якія меркавалі зацяжарыць і нарадзіць дзіця, а таксама ў час цяжарнасці, нарадзіць блізнят, калі будуць ужываць падвоеныя слівы, яйкі і г.д., так званыя «спарышы».

◈ Каб у сям'і не нарадзіліся блізняты, у паўсядзённым жыцці выконваліся пэўныя правілы. Напрыклад, калі жанчына ставіла булкі хлеба ў печ, трэба было пакласці іх так, каб яны ў час выпечкі не дакраналіся адна да другой і не «аб'ядналіся» паміж сабой, не «ўтварылі» той самы спарыш.


**Добрая навіна!**
**У нашым палку прыбыло!**



Вядучая звяздоўскай «Сямейнай газеты» **Вікторыя ЦЕЛЯШУК** абяцала чытачам заняцца «рэалізацыяй асабістых дэмаграфічных планаў».
І не падманула: падарыла свету яшчэ адну цудоўную дачушку!
*Шануйнай матульцы, бацьку, таксама звяздоўцу **Івану ХВІРУ**, бабулям-дзядулям, усёй вялікай радні найшчырэйшыя віншаванні! А да іх — пажаданні здароўя, удачы, грошай, цярпення... Усяго, што трэба дзіцяці, каб расці на пацеху!*

**Калегі.**


## Даты Падзеі Людзі

**2 ЧЭРВЕНЯ**

**1065** год — 950 гадоў з часу першага згадвання (у летапісе Быхаўца і хроніцы Мацея Стрыйкоўскага) горада Браслава (Брячыслаўль, Брятислав). Браслаў — старажытнае славянскае паселішча, якое размешчана на мяжы паміж славянскімі і літоўскімі плямёнамі. Па некаторых звестках, горад заснаваны полацкім князем унукам Рагнеды Брачыславам Ізяславічам (княжыў у 1003-1044 гадах). Ён далучыў да Полацкага княства землі паміж Заходняй Дзвіной і Дзісной, дзе і вырас горад. У 1500 годзе Браслаў атрымаў магдэбургскае права. У 1792-м зацверджаны герб — на блакітным полі залатое сонца, у цэнтры якога блакітны трохкутнік з выявай чалавечага вока.



**1904** год — нарадзіўся Джоні Вайсмюлер, амерыканскі плывец, пяціразовы алімпійскі чэмпіён, кінаакцёр. Ён стаў займацца плаваннем у падлеткавым узросце і ўжо ў 18 гадоў устанавіў новы рэкорд свету ў заплыве на сто метраў, пераадолеўшы іх за 58,6 секунды. У 1924 годзе Джоні станавіўся алімпійскім чэмпіёнам у Парыжы на гэтай дыстанцыі. На тых жа Алімпійскіх гульнях ён выйграе і на дыстанцыі ў 400 метраў, акрамя таго, перамагае ў эстафеце 4х200 метраў. На наступных Алімпійскіх гульнях, у Амстэрдаме, Вайсмюлер заваёўвае яшчэ два алімпійскія залатыя медалі. Таксама спартсмен станавіўся чэмпіёнам Злучаных Штатаў Амерыкі 52 разы і ўстанаўліваў 67 сусветных рэкордаў! Славу і фінансавы поспех яму прынеслі не толькі спартыўныя дасягненні. Джоні Вайсмюлер зняўся ў 16 фільмах пра Тарзана. Яго агульныя ганарары за гэтыя фільмы склалі 2 мільёны долараў.

**1972** год — нарадзілася (вёска Асечана Крупскага раёна) Кацярына Анатольеўна Карстан, беларуская спартсменка (веславанне акадэмічнае). Заслужаны майстар спорту Беларусі. У 1990-1992 гадах — у складзе зборнай каманды СССР, з 1993-га — у нацыянальнай камандзе Беларусі. Чэмпіёнка свету сярод юніёраў (1990, Францыя), чэмпіёнка свету (1997, г. Эгвебелет, Францыя; 1999, г. Сент-Катарынс, Канада). Чэмпіёнка XXVI і XXVII Алімпійскіх гульняў (1996, г. Атланта, ЗША; 2000, г. Сідней, Аўстралія). Чэмпіёнка Гульняў добрай волі (1994, г.Санкт-Пецярбург). Чэмпіёнка СНД (1992). Уладальніца Кубка свету (1997, 2000). Чэмпіёнка Францыі (2001, 2002). Найлепшая спартсменка года Беларусі (1996, 1999).

### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**

*Вялікія людзі нашчадкам у генах заўжды завяшчаюць любоў.*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.44 | 21.32 | 16.48 |
| Віцебск — | 4.26 | 21.29 | 17.03 |
| Магілёў — | 4.34 | 21.22 | 16.48 |
| Гомель — | 4.39 | 21.09 | 16.30 |
| Гродна — | 5.01 | 21.45 | 16.44 |
| Брэст — | 5.10 | 21.37 | 16.27 |

**Месяц**

*Поўня ў 18.19.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

***Пр.** Аляксандра, Аляксея, Цімафея.*
***К.** Марыяны, Пятра.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Як вы думаеце, навошта пры гатаванні шашлыку махаюць махалам над вуголлем? Думаеце, раздзімаюць? А вось і не! Гэта каб суседзі слінай захлынуліся!**

Самае страшнае — гэта калі бабуля кажа, што табе трэба пахудзець.

**— Дарагая, ты раўнуеш?**
**— Не.**
**— Дарагая, ты раўнуеш?**
**— Я ж адказала табе — не!**
**— Дарагая, давай пацалуемся?**
**— Цалуйся з тым пудзілам, якому спадабаўся твой статус «ВКонтакте»!**





Раковская птицефабрика РЕАЛИЗУЕТ НАСЕЛЕНИЮ
**ИНДЮШАТ** Биг-6 (Польша),
**ИНДЮКОВ** (90 дней),
**ЦЫПЛЯТ КУР НЕСУШЕК** (Хайсекс),
**КУР НЕСУШЕК** (Хайсекс) 360 дней.
МТС (8029) 573 36 22, Velcom (8029) 152 03 53. УНП 190593421



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2136.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 1 чэрвеня 2015 года.

Шчучынская раённая газета

# Дзянніца

Шчучынская раённая газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Выдаецца з верасня 1939 года

http://www.dzyannica.by/

Аўторак, 2 чэрвеня 2015 года
№ 42 (8874)

Кошт 2000 рублёў

З нагоды

## Паклікаў званок развітальны ў мора жыццёвае плыць...

**На ўрачыстай лінейцы, прысвечанай заканчэнню навучальнага года, васілішкаўскія першакласнікі атрымалі ў падарунак мячы ад асацыяцыі Беларускай федэрацыі футбола і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Апошніх дзён мая заўсёды з нецярпеннем чакаюць усе школьнікі: гучныя і вясёлы званок задорна абвяшчае аб заканчэнні навучальнага года і пачатку летніх канікул. Толькі ў гэтым агульным свяце ёсць і сумныя ноткі: са школай развітваюцца выпускнікі. Гэта ў іх адрас гучаць самыя цёплыя словы, гэта ім жадаюць поспехаў на экзаменах і тэсціраванні, а таксама шчаслівай дарогі ў дарослае жыццё.**



Гучыць апошні школьны званок

З заканчэннем навучальнага года павіншавала ўсіх вучняў Васілішкаўскай сярэдняй школы, а таксама іх бацькоў дырэктар Ларыса Андрыянаўна Фяцісава. Выпускнікам яна пажадала дастойна вытрымаць усе выпрабаванні, не забываць школу і сваіх аднакласнікаў, а першакласнікам – раўняцца на сваіх старэйшых сяброў і старацца добра вучыцца. Ларыса Андрыянаўна нагадала, што сёлетняя лінейка асаблівая: нядаўна наша краіна адзначыла 70-годдзе Вялікай Перамогі. І вельмі прыемна, што васілішкаўскія рабяты стараюцца быць дастойнымі сваіх дзядоў і прадзедаў. Яны пацвярджаюць гэта выдатнай вучобай, перамогамі ў конкурсах і алімпіядах і высокімі спартыўнымі дасягненнямі.



Узнагароды за спартыўныя перамогі Андрэю Някрэвічу ўручае І.В. Гваздоўскі

Са шчырымі віншаваннямі да ўдзельнікаў урачыстай лінейкі звярнуўся намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Шчучынскага райвыканкама Іван Вікенцьевіч Гваздоўскі. Ён адзначыў, што Васілішкаўская школа па праве займае адно з вядучых месцаў у шэрагу ўстаноў адукацыі раёна, з'яўляецца прыкладам арганізацыі цеснага супрацоўніцтва педагагічнага калектыву, бацькоў, кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі.

Да яго слоў далучыўся дырэктар ААТ «Васілішкі» Уладзімір Часлававіч Серахан і ад імя ўсіх работнікаў таварыства пажадаў выпускнікам зрабіць правільны выбар, а таксама нагадаў, што ААТ «Васілішкі» – адно з буйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рэспублікі, займае перадавыя пазіцыі ў вытворчасці сельгаспрадукцыі і ў сувязі з гэтым заўсёды мае патрэбу ў кваліфікаваных кадрах. Ён запрасіў выпускнікоў вяртацца працаваць у родную гаспадарку пасля атрымання абранай прафесіі.

У чарговы раз нагадаў школьнікам пра неабходнасць берагчы сваё жыццё і не парушаць закон старшы інспектар групы тылавога забеспячэння Шчучынскага РАУС Яўгеній Аляксандравіч Мецько.

Высокія дасягненні рабят у алімпіядным руху былі адзначаны дыпломамі, якія ўручыла юным дараванням дырэктар школы. А вось ганаровую місію ўзнагароджання спартсменаў выканаў І.В. Гваздоўскі. Адразу некалькі дыпломаў, грамату аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, легкаатлетычную форму і падарунак ад школы атрымаў выпускнік Андрэй Някрэвіч. Каманда Гродзеншчыны, у састаў якой уваходзіў Андрэй, заняла другое месца на рэспубліканскім этапе мнагабор'я "Абаронца Айчыны". Узнагародамі за спартыўныя дасягненні былі адзначаны і іншыя рабяты.

...Ледзь стрымліваючы слёзы, звярнулася да сваіх ужо дарослых выхаванцаў першая настаўніца выпускнікоў Ганна Віктараўна Вашчыла. Яна нагадала ім пра першы званок, першы ўрок, першы перапынак...

– Спыніцеся на хвілінку ў школьным калідоры, глыбей удыхніце гэта асаблівае паветра – у вас засталося толькі некалькі дзён, калі вы можаце адчуваць сябе вучнямі і дзецьмі... Тры месяцы аддзяляюць вас ад дарослага жыцця: чэрвень – час іспытаў, ліпень – перыяд прыняцця складаных рашэнняў і жнівень – час чароўных зарападаў. Злавіце сваю шчаслівую зорачку і не адпускайце яе...

Калі спраўдзяцца ўсе пажаданні, што адрасавала сваім любімым вучням класны кіраўнік Ганна Іосіфаўна Герасімовіч, без сумнення, яны стануць шчаслівымі і паспяховымі. А бацькоўскія словы на дарогу, якія прагучалі ад Зоі Казіміраўны Аксціловіч, будуць самым моцным абярэгам для дзяцей.

Не маглі ў гэты дзень застацца ў баку ад сур'ёзнай падзеі ў жыцці выпускнікоў першакласнікі. Яны прадэкламавалі адзінаццацікласнікам жартоўныя вершыкі. А тыя ў сваю чаргу ўручылі сваім маленькім сябрам падарункі, а таксама футбольныя мячы ад асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

– Дарыць рабятам футбольныя мячы стала добрай традыцыяй, – патлумачыў І.В. Гваздоўскі. – Ужо чацвёрты год запар у рамках рэспубліканскай акцыі «Падары дзіцяці мяч» першакласнікі з аграгарадкоў атрымліваюць гэты нязменны атрыбут летняга адпачынку. Уручаць мячы васілішкаўскім школьнікам было надзвычай прыемна: хлопчыкі і дзяўчынкі па-сапраўднаму сябруюць са спортам. Увогуле, сёння футбольныя мячы атрымалі больш за 130 першакласнікаў школ аграгарадкоў нашага раёна.



Падарункі – першакласнікам

... Далёка ў цёплым майскім паветры разносіліся гукі цудоўнага школьнага вальса... Разам з шарыкамі высока-высока ў неба адляцелі юначыя мары... «Анёл-ахоўнік» школы ўручыў выпускнікам званок, гук якога абвясціў аб заканчэнні чарговага навучальнага года. Выпускнікі Кацярына Лапян, Юлія Панасевіч і Андрэй Някрэвіч апусцілі сцяг Рэспублікі Беларусь. Адзінаццацікласнікі рука аб руку з бацькамі пакінулі школьны двор. Іх праводзілі класныя кіраўнікі. Адзінаццаць год таму школа сустракала маленькіх няўрымслівых першакласнікаў. Сёння яе пакідаюць дарослыя юнакі і дзяўчаты. Шчаслівай дарогі!

**Ганна РУДСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

## Власть на связи даже по субботам

**(график проведения «прямых линий»)**

| Дата проведения | Фамилия, имя, отчество | Должность |
|---|---|---|
| 27 июня | Соколовский Иван Юльянович | председатель Щучинского районного Совета депутатов |
| 13 июня | Хомич Геннадий Болеславович | первый заместитель председателя Щучинского районного исполнительного комитета |
| 6 июня | Мойсей Ян Брониславович | заместитель председателя Щучинского районного исполнительного комитета |
| 20 июня | Давыдова Елена Войтеховна | управляющий делами – начальник управления делами Щучинского районного исполнительного комитета |

**Время проведения еженедельных (по субботам) «прямых телефонных линий» с 9.00 до 12.00, телефон 2 84 85.**

**УВАГА: "ПРАМАЯ ЛІНІЯ"**

**4 чэрвеня з 10.00 да 11.00** адбудзецца «прамая лінія» са старшынёй суда Шчучынскага раёна **Раманоўскім Валерыем Яцэнтавічам** па пытаннях арганізацыі работы суда. Тэлефануйце па нумары: **28-7-33.**

## В ТЕМУ

Школьные формы советского образца – белые передники, бантики. Эта чудесная традиция, сохранившаяся с давних времен в средней школе № 1 г. Щучина, греет души земляков и сегодня. Коричневые платьица с белыми воротничками и фартуками передаются по наследству, и девочки 21 века выглядят так же, как их мамы в школьной юности. Еще одну замечательную традицию продолжили выпускники 2015 года первой городской школы: каждый класс посадил свое дерево в Аллее Выпускников.

* * *

На территории гимназии накануне линейки выпускники высадили целое море цветов, поддержав таким образом устоявшуюся традицию восстановления элементов ботанического сада С. Б. Юндзилла. Это – своего рода живой подарок тем, кто состоится в гимназии.

Впервые за десять лет существования Щучинской гимназии на «отлично» учебный год закончили 112 (!) гимназистов, т.е. каждый третий! Эти цифры свидетельствуют о высокой степени мотивации гимназистов, их трудолюбии и прилежании. В этом году стены альма-матер покидают 50 выпускников. Все они ярко проявили себя во время школьной жизни: среди них призеры областных и республиканских олимпиад и спортивных соревнований, творческих конкурсов. Именно поэтому впервые на линейке в гимназический музей «Образование Щучинщины» от двух выпускных классов переданы две ленты выпускников с групповыми фото классных коллективов. Имена выпускников в буквальном слове будут вписаны в историю гимназии. После линейки выпускники-гимназисты дружно отправились на экскурсию на Августовский канал.

* * *

На линейке в Головичпольском д/с-СШ присутствовали воспитанники Василишковского доманинтерната для детей с особенностями психофизического развития, которые обучаются в этой школе. В этом году впервые в истории доманинтерната его воспитанник Сергей Волковицкий получил аттестат об окончании общего среднего образования. Прощаясь со школой, выпускники запустили в небо шарики с прикреплёнными бумажными голубями с пожеланиями сверстникам.

**Алла БИБИКОВА.**

**Працягваецца падпіска на самую даступную, цікавую і неабходную газету "Дзянніца" на 2-ое паўгоддзе.**

## Рэха падзеі

# У прыгранiччы гучаць песнi

**У Дзень пагранічніка на пляцоўцы ля Берштаўскага клуба-бібліятэкі было надзвычай людна. На гэты раз мясцовае насельніцтва і ахоўнікаў дзяржаўнай мяжы аб'ядналі ... песні і цікавая культурна-забаўляльная праграма.**

– Кожны з нас прысягнуў на вернасць Радзіме і пакляўся стойка абараняць яе рубяжы, – гаворыць начальнік пагранпаста "Бершты" Сяргей Мікалаевіч Тоўсцік. – І мы дастойна нясём сваю службу. Да прыкладу, у бягучым годзе не дапусцілі ніводнага незаконнага пераходу граніцы. Падтрымліваць парадак у прыгранiччы нам дапамагаюць самі берштаўцы, якія ўваходзяць у склад добраахвотнай дружыны. Яны заўсёды інфармуюць нас аб з'яўленні ў акрузе падазроных чужакоў. Акрамя таго, мы цесна супрацоўнічаем са Шчучынскім РАУС і аддзелам ДАІ, дапамагаем мясцоваму насельніцтву і сацыяльнай службе.





У той дзень з прафесійным святам пагранічнікаў віншавалі намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Аляксандр Генрыхавіч Амшэй, старшыня Астрынскага сельвыканкама Ганна Юзафаўна Бекіш і ветэран Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Мікалаевіч Даніловіч.

– Ваша служба надзвычай важная і адказная, – падкрэсліў былы франтавік. – Менавіта вы стаіце на варце міру і спакою на нашай зямлі. Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і сямейнага дабрабыту. Будзьце дастойнымі нашчадкамі салдат Перамогі і не пусціце ворага на родны парог.

Свята ў Берштах



... Гучалі песні ў выкананні артыстаў Навадворскага ЦДК, сяльчане кружыліся ў вальсе. А самыя маленькія сельскія жыхары ў гэты час забаўляліся на надзіманай горцы. Пасля музычнай часткі для ўдзельнікаў свята была арганізавана гульнявая праграма. Адным словам, Дзень пагранічніка надоўга запомніцца як дарослым, так і дзецям.

**Аляксандр КАСПЯРЧУК.**
**Фота аўтара.**

## І я там быў...

# Сагрэты Слонім промнем паланеза...

**Нядаўна ў Слоніме адбыўся адзінаццаты адкрыты рэгіянальны фестываль паланеза. Больш за 20 творчых калектываў з Беларусі і Польшчы выступілі на фестывальнай сцэне. Народны хор польскай песні "Промень" са Шчучына па выніках конкурснай праграмы быў узнагароджаны дыпломам другой ступені ў намінацыі "Вакальна-харавыя калектывы".**



**На фестывальнай сцэне ў Слоніме – народны ансамбль польскай песні «Промень» Шчучынскага РДК**

Свята традыцыйна распачалося ў гарадскім скверы. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слонімскага райвыканкама Наталля Юнчыц прывітала ўдзельнікаў і гасцей фестывалю, а таксама паведаміла аб тым, што сёлета аднаўляецца даўняя традыцыя і цяпер кожны дзень у 12 гадзін з былой пажарнай вежы над горадам будуць гучаць чароўныя гукі паланеза «Развітанне з Радзімай».

Пасля ўшанавання памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны і ўскладання кветак да помніка на брацкай магіле калона ўдзельнікаў свята ў нацыянальных строях пад гукі духавога аркестра накіравалася да Цэнтра культуры. Слонімцы сардэчна віталі артыстаў і з задавальненнем рабілі "сэлфі" з удзельнікамі шэсця.

На фестывальнай сцэне гледачы і прафесійнае журы ўбачылі сапраўднае сузор'е талентаў. Паланезы гралі, спявалі, танцавалі. Музыка захапляла, клікала да сонца і да зор, напаўняла ўдзячныя сэрцы асалодай. Асабліва цёпла гледачы сустрэлі выступленне шчучынскага хору. З апошнімі гукамі самага знакамітага твора таленавітага сына слонімскай зямлі, які выконвалі "промнеўцы", зала патанула ў авацыях.

Пасля завяршэння конкурснай праграмы эпіцэнтрам свята стала галоўная плошча горада, дзе была ўсталявана сцэна, разнастайныя атракцыёны, а таксама разгарнуўся бойкі гандаль сувенірамі і прысмакамі. Удзельнікі фестывалю падарылі гледачам гала-канцэрт, сабраны з самых лепшых нумароў.

Напрыканцы адбылося ўзнагароджанне пераможцаў у розных намінацыях. Журы доўга вырашала, хто ж лепшы сярод вакальна-харавых калектываў, але так і не змагло вызначыць лідара. У выніку першае месца не сталі прысуджаць нікому, а дыпломамі другой ступені былі ўзнагароджаны хор "Промень" Шчучынскага РДК і хор "Вспомнене" з Пінска.

Фестываль скончыўся, але яшчэ доўга ў памяці яго удзельнікаў і гледачоў будуць гучаць знаёмыя матывы. І кожны захавае ў душы маленькую зорачку, пяшчотны агеньчык, які абагрэе ў самыя лютыя маразы, высушыць пякучыя слёзы крыўды, сваім нязгасным святлом пакажа правільную дарогу і праз год ізноў успыхне бліскучым феерверкам чарговага свята паланеза.

**Аляксандр АМШЭЙ,**
**намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі.**
**Фота аўтара.**

### З першых вуснаў

**Аляксей Аляксеевіч МІЦАЙ, мастацкі кіраўнік народнага хору польскай песні "Промень":**



– Сёлетні фестываль можа быў не такі масавы, як мінулагодні юбілейны. Але гэта зусім не азначае, што саперніцтва было лёгкім. Уразіў высокі ўзровень выканаўцаў, якія прадэманстравалі свой прафесіяналізм на сцэне. Можна смела сцвярджаць, што кожны калектыў даўно перарос аматарскі ўзровень. Да прыкладу, наш "Промень" існуе ўжо болей за 25 гадоў. Канешне, калі параўнаць гэты ўзрост з нашым польскім сябрам – хорам "Васілёчкі" з Бельску-Падляскага, які адзначыў 50-гадовы юбілей, то мы яшчэ юныя. Аднак практычна з кожнага фестывалю мы вяртаемся з узнагародай. Вось і гэтым разам другі год запар атрымалі дыплом другой ступені. Значыць, ёсць падставы для росту, і на наступны год, калі крыху папрацуем, зможам падняцца яшчэ на адну прыступку вышэй. Тым больш, што слухачы і нават калегі-канкурэнты станоўча ацанілі наша выступленне.

Карыстаючыся выпадкам, хачу падзякаваць ад імя ўсіх удзельнікаў нашага хору за дапамогу і падтрымку кіраўніцтва раёна і, у прыватнасці, старшыні райвыканкама Сяргею Васільевічу Ложэчніку. У мінулым годзе мы атрымалі ў падарунак прыгожыя сцэнічныя касцюмы, да нашых просьбаў заўсёды прыслухоўваюцца і нам ідуць насустрач. Гэта сведчыць аб тым, што раённая ўлада разумее важнасць нашай творчай працы і спрыяе новым поспехам.



Буква закона

# Прощание с... автомобилем

## ждёт тех, кто сел за руль пьяным дважды в течение года. И не важно, кто находится за рулём, – владелец машины или другой человек

**С 24 октября 2013 года вступили в силу изменения и дополнения в Уголовный кодекс Республики Беларусь и Кодекс об административных правонарушениях, которые касаются ужесточения ответственности за управление транспортным средством в состоянии алкогольного опьянения. Напомним, что за совершение такого преступления повторно в течение года после привлечения к административной ответственности предусмотрена уголовная ответственность по ст. 317-1 УК РБ и наказание в виде исправительных работ, ареста со штрафом, или ограничения свободы со штрафом или лишением свободы и лишением права управления транспортным средством на 5 лет. Также ст. 61 Уголовного кодекса предусмотрена конфискация транспортного средства, которым управляли в состоянии алкогольного опьянения, независимо от права собственности.**

«Вину признаю и раскаиваюсь», – эмоционально заявляют водители, задержанные за управление транспортным средством в состоянии алкогольного опьянения. Но далеко не все из них по-настоящему переосмысливают свой опасный поступок и становятся законопослушными гражданами. Очень скоро нарушители забывают об обещании не пить, не садиться за руль «под мухой». Не посещает таких людей и мысль о своей принадлежности к достаточно большой армии потенциальных убийц на дороге, в руках которых транспортное средство становится орудием преступления. Страшно, что каждый из нас может стать жертвой водителя «навеселе». Хорошо, что многих из них удаётся вовремя остановить.

Вот и житель пригородной деревни Григорий Дедин (фамилия и имя изменены. – Прим. авторов) прекрасно знал, что его ждет, если вновь попробует сесть за руль нетрезвым. Ведь уже однажды нарушил закон. Уплатил штраф в размере свыше шести миллионов рублей. Мужчину предупредили: ещё раз сядешь за руль пьяным – лишишься автомобиля. Но через два месяца случилась с человеком амнезия – «забыл» всё напрочь, и об обещании «никогда больше» также. Вряд ли пришла в голову мысль о негативных последствиях и степени общественной опасности такого шага. Куда доехал бы пьяным, неизвестно. К счастью, нашелся неравнодушный человек и сообщил о «пьяном» автомобиле в милицию. «Встречать» его направили наряд ГАИ.

### ЦИТАТА В ТЕМУ

**Генеральный прокурор Республики Беларусь Александр КАНЮК:**

*«За последние 10 лет в Беларуси по вине нетрезвых водителей погибло столько же, сколько советских военнослужащих во время войны в Афганистане».*

«Как-то так получилось», – оправдывался мужчина. Мол, в тот день ремонтировал автомобиль, поехал к знакомому в другую деревню подзарядить аккумулятор. Возвращался назад, машина заглохла. Неприятность решил «залить» водкой, которая была в салоне. И о чудо! Когда спиртное было допито, двигатель авто ожил. Пьяный хозяин вновь тронулся в путь. Когда увидел экипаж ГАИ, повторять старый трюк – скрываться от милиционеров – не стал, тормознул на обочине. Несвязная речь и шаткая походка выдали с первой минуты. Медосвидетельствование подтвердило: пьян. В тот день гражданин «наездил» ещё на несколько протоколов: не имел права управлять транспортным средством, отсутствовала страховка и т.д. А поскольку Дедин повторно в течение года после наложения административного взыскания управлял автомобилем в состоянии алкогольного опьянения, то в его действиях усматривались признаки преступления, предусмотренного статьей 317-1 Уголовного кодекса.

Был суд. Григорию Дедину назначено наказание в виде трёх месяцев ареста с лишением права управления всеми видами транспортных средств на срок пять лет со штрафом в доход государства в размере 100 базовых величин, что



составляло на тот момент 15 миллионов рублей. Конфискован и автомобиль преступника.

И вторая поучительная история. Она для тех, кто без раздумий отдаёт собственное авто в пользование соседу, родственнику, другу…

Житель Брестчины Андрей А., многократно судимый преимущественно за хулиганство, приехал на заработки в одно из хозяйств Щучинского района. Проживал в общежитии. Сюда же, благо телефон теперь у каждого в кармане, пригласил в гости своего знакомого с родных мест – Кирилла. Тот оказался лёгким на подъём, попросил у брата ключи от автомобиля (водительские права имел), чтобы покататься, и махнул на «бусике» … за несколько сот километров. А чтобы было веселее в дороге, взял с собой попутчика – общего друга. Последний прикупил несколько бутылок пива и продукты.

Встреча друзей состоялась примерно в час ночи. Компания собралась весёлая. Общались, выпивали. Ближе к утру принимающей стороне – Андрею – вдруг захотелось взглянуть на красоты Щучина, и он попросил у гостя воспользоваться «Фольксвагеном-Транспортёром», на котором тот приехал. Кирилл оказался добряком и доверил другу автомобиль, если помните, принадлежащий вовсе не ему, а брату. Потом оправдывался: ведь друг учился в автошколе и наверняка имел водительские права. Если бы он знал, насколько опрометчивым было это решение…

Обрадованный Андрей А. взял в ночную поездку второго приятеля, который приехал с Кириллом. Рулил сам. Ночной город обоих не заинтересовал, а вот местные жители, вышедшие из кафе, оказались в самый раз. Вспыхнувшую дружбу продолжили «укреплять» напитками с градусами возле озера и в салоне авто. Водитель, глядя на компанию, продержался недолго. Потянув руку к пакету, обнаружил в нём бутылку пива. «Очень хотелось пить, – пояснял он потом. – Надеялся, что от нескольких глотков не опьянею». Но, видимо, сильная была жажда: вскоре бутылка опустела. Когда светало, новые друзья попросили развезти по домам. Подвыпивший Андрей согласился, решив, что в такую рань щучинские правоохранители уж точно спят.

Стражи правопорядка добросовестно несли службу и заметили на одной из улиц «виляющий» автомобиль. А дальше, как говорится, действовали по инструкции. Здесь и выяснили, что у водителя нет прав на управление транспортным средством. Он уже был судим по статье 317-1 ч.2 УК Республики Беларусь за управление автомобилем в состоянии алкогольного опьянения и приговорен к штрафу в размере 450 базовых величин, который так и не уплатил. На путь исправления не стал. Освидетельствование показало, что в крови у парня 1,5 промилле алкоголя.

А что Кирилл, проделавший столь неблизкий путь для встречи с отнюдь не законопослушным другом? Утром ему предстояла дорога в отдел ГАИ, потом объяснение с братом. И сильное потрясение от известия, что на автомобиль, на котором катался по его разрешению пьяный Андрей, наложен арест в административном порядке.

Суд Щучинского района приговорил Андрея А. к аресту сроком на четыре месяца, на пять лет лишил его права управлять транспортными средствами со штрафом сто базовых величин (на тот момент это 15 миллионов рублей). Была в приговоре ещё одна фраза: «Автомобиль … конфисковать в доход государства». Так машиной брата расплатился Кирилл за неосмотрительное решение доверить дорогостоящее имущество хулигану и пьянице.

**Дмитрий СИНИЛО,**
**помощник прокурора.**
**Татьяна ВИТАЛЬЕВА.**

### Компетентно

**Андрей ШЕРШЕНЬ, старший госавтоинспектор ОГАИ Щучинского РОВД:**

– На территории Щучинского района в прошлом году за управление транспортными средствами в состоянии алкогольного опьянения было задержано 130 человек, из них 9 – повторно в течение года. Привлечено к ответственности 11 нетрезвых водителей и механизаторов, которые управляли транспортом предприятий и организаций. К сожалению, ужесточение мер за пьянство за рулём подействовало не на всех, и после внесения изменений в законодательство число задержанных за управление транспортом в нетрезвом состоянии не уменьшается. Вот и в этом году уже нарушили закон 38 граждан, пятеро из них в пьяном виде сели за руль служебных машин. Трое, не сделав выводов, повторили действия, за которые уже были наказаны, – вновь выехали на дорогу пьяными. Так, на прошлой неделе сотрудники ГАИ остановили мотоциклиста «под градусом». За этим человеком – шлейф правонарушений. В прошлом году он уже выписывал зигзаги по дороге на «Пассате» знакомого, был привлечен к уголовной ответственности, осужден. Кстати, тот автомобиль по приговору суда конфисковали. Теперь вот безответственный гражданин не побоялся, будучи пьяным, «оседлать» мотоцикл …

Хочу обратить внимание на один аспект. Применение специальной конфискации не зависит от того, кому принадлежит транспортное средство на праве собственности, – виновному физическому лицу или юридическому (хозяйству, предприятию), где работает нарушитель. Уже имели место случаи, когда по приговору суда за преступления по ст. 317-1 УК были конфискованы транспортные средства предприятий. Руководителям стоит быть особо внимательными при приёме на работу людей, которым предполагают доверить управление служебным транспортом. Некоторые кандидаты в водители и трактористы утаивают, что уже лишены права управления в состоянии алкогольного опьянения. А вывести их на чистую воду можно просто, не выходя из кабинета. Списки лиц, лишенных права управления, есть на сайте ГАИ УВД Гродненского облисполкома**: gai grodno.by, в разделе «Нарушение и наказание».**

### Стоит задуматься

- По данным МВД, ежегодно выявляется 50-55 тысяч фактов управления транспортными средствами в состоянии опьянения. Каждый день ГАИ останавливает около 50 пьяных водителей. По статистике, практически каждый десятый после привлечения к административной ответственности садится за руль «под хмельком» в течение года.
- Пьянство за рулём является тем бичом, который оставляет зарубины на судьбах целых семей. Водители, находящиеся под воздействием спиртного, совершают около 14% ДТП.
- По данным Верховного Суда, в минувшем году в Беларуси у пьяных водителей было конфисковано 2026 машин за повторное в течение года вождение в нетрезвом виде. На аукционах в Минске, Гродно и Бресте было продано 927 конфискованных транспортных средств на 59,78 млрд рублей (5,85 млн долларов).




■ Духоўнасць

# Той, хто спявае, моліцца двойчы

**Дзесяцігоддзе адзначыў моладзевы хор „Calasanz", які існуе пры парафіі імя святой Тэрэзы Авільскай у Шчучыне. У раённы Дом культуры на святочны канцэрт з нагоды падзеі сабраліся жыхары райцэнтра, госці, святары, былыя ўдзельнікі калектыву.**



Амаль дзве гадзіны са сцэны гучалі цудоўныя спевы – рэлігійныя і свецкія. Трапятала сэрца, узносілася да нябёсаў душа. Зала ўзрывалася апладысментамі і потым зноў замірала, каб далучыцца да таямніцы духоўнага мастацтва.

– Дзесяць год таму група каталіцкай моладзі вырашыла ўпрыгожыць імшу, – распавядае Людміла Казлова, музычная кіраўніца хору, выкладчыца Васілішкаўскай дзіцячай школы мастацтваў. – Развучылі некалькі твораў, парадавалі землякоў і нават не заўважылі, як яднанне галасоў і душ стала нашай неабходнасцю. Нас падтрымалі айцы піяры – нашы духоўныя апекуны. З тае пары спяваем. Кажуць, той, хто спявае, моліцца двойчы…

"Calasanz" для Людмілы – значная частка жыцця і духоўная запатрабаванасць. Яна – нязменная кіраўніца хору ад самага яго стварэння. Нават вярнулася ў Шчучын пасля атрымання прафесіі менавіта таму, што не змагла ўявіць свайго існавання без калектыву.

Штогод аднаўляўся састаў: выпускнікі ад'язджалі на вучобу і пакідалі хор, але замест іх прыходзілі новыя падлеткі. Той, хто аднойчы



адчуў сябе членам гэтай вялікай духоўнай сям'і, назаўжды захаваў у сэрцы радасць творчай супольнасці.

Не дзіва, што выпускнікі так дружна прыехалі на свята з розных куткоў краіны (а хто не змог прыехаць, даслаў відэапасланне. – Заўв. аўтара). Яны, як і дваццаць адна сённяшняя ўдзельніца хору, адчувалі сябе імяніннікамі і атрымалі падарункі на памяць. А прысутныя далучыліся да гісторыі калектыву праз мультымедыйную прэзентацыю і аповед вядучай імпрэзы Алёны Мыслівец.

Прыгожыя сольныя нумары падарылі шчучынцам былыя ўдзельнікі хору Ганна Ардынец, Ілона Пацук і Антон Грыневіч. Гэтыя таленавітыя маладыя людзі адзначылі, што ўдзел у калектыве даў ім эмацыянальны запал займацца творчасцю і пасля развітання са Шчучынам, а камусьці, як Антону, – прысвяціць сябе музыцы прафесійна.

– Мы цешымся нашым моладзевым хорам, - падкрэслівае пробашч касцёла імя святой Тэрэзы Авільскай ксёндз Вітальд Пяцельчыц. - Ягонае існаванне дапамагае ў рэлігійным выхаванні моладзі, аб'ядноўвае яе. Сваімі спевамі калектыў упрыгожвае нашы святы, парафіяльныя мерапрыемствы, паспяхова ўдзельнічае ў фэстах і канцэртах як у Беларусі, так і ў Польшчы, яднае людзей розных краін.

… У цёплай атмасферы дзве гадзіны праімчаліся непрыкметна. Зала праводзіла таленавітых удзельніц хора "Calasanz" стоячы, шквалам апладысментаў, кветкамі і словамі шчырай падзякі.

З дзесяцігоддзем, "Calasanz"!

**Ала БІБІКАВА.**
**Фота аўтара.**

**Юрий Железовский**

***

*Всё, что зрим, – торжество есть Господне.*
*И невидимый мир – от Него.*
*Только с Ним лишь вздохну я свободно*
*И украшу себя самого.*

*Ничего нет светлей благодати,*
*Слаще пламенных тихих молитв.*
*Бог дал всё. И ещё может дать мне*
*Излеченье всему, что болит.*

*В Нём – надежда, любовь и отрада,*
*И тепло, и та светлая грусть.*
*Обращаться к Нему только надо.*
*Час ночной я дождусь и взмолюсь.*

*Попрошу утешенья, защиты,*
*Попрою с верой новых надежд,*
*И того вразумленья, что скрыто.*
*Пусть нас радость встречает везде.*

■ Дарога да Бога

# Свята душы

**Сто хлопчыкаў і дзяўчынак падчас святой імшы прынялі першую Святую Камунію ў парафіяльным касцёле Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучына. Гэта падзея стала сапраўдным святам душы для юных вернікаў і іх родных.**



Да сакраменту дзеткі рыхтаваліся два гады: вывучалі малітвы, катэхізіс, здавалі экзамен, імкнуліся пазнаць Пана Бога і наблізіцца да яго. Рыхтаваў іх да гэтай важнай падзеі вікарый Шчучынскай парафіі айцец Аляксандр Махнач. Ён і раздзяліў з дзецьмі ўрачыстасць падзеі. А ўзначаліў Богаслужэнне пробашч парафіі айцец Вітальд Пяцельчыц.

**Фота Аляксея БІБІКАВА.**

■ Ад шчырага сэрца

# Іскрынка дабрыні

**Яшчэ вельмі рана. І ў касцёле вернікаў зусім няшмат. Хіба толькі тыя, што прыехалі аўтобусамі з суседніх вёсак. Стаіць цішыня, здаецца, нейкая чыстая і празрыстая. Людзі праз малітвы, праз ружанец размаўляюць з Богам, Маці Божай, дзякуючы за іх прысутнасць, дабрыню, ласку, просячы здароўя, дапамогі, парады.**

На першай лаўцы, куды заўсёды імкнуцца дзеці ў час імшы, крыху ссутуліўшыся, склаўшы далонькі човенкам і ўтуліўшы іх паміж каленак, сядзіць хлопчык гадоў пяці-шасці. Аднаму Богу вядома, якімі думкамі занята яго галоўка.

А касцёл усё поўніцца. Хутка праз бакавыя дзверы ўвайшоў пробаршч Ян і сваёй лёгкай паходкай накіраваўся ў сакрыстую.

Праходзячы каля хлопчыка, ён спыніўся, цёпла ўсміхнуўся, нахіліўся над ім, нешта шапнуў на вушка, прытуліў да сябе і пакрочыў далей. І нібы іскрынка дабрыні прабегла паміж імі. Хлопчык раптам страпянуўся, выпрастаўся, агледзеўся назад (пэўна, там сядзела яго маці). І столькі радасці і шчасця, яшчэ нечага такога, што не выкажаш словамі, зазззяла ў гэтых шэра-блакітных вочках….

А іскрынка шуганула ўжо па ўсім касцёле. Тыя, хто назіраў за гэтым, таксама шчыра і цёпла заўсміхаліся, і ў іх вачах свяціліся такія ж цяпло і ласка, добразычлівасць.

Добры Божа! Дапамажы людзям, каб іскрынка дабрыні вітала не толькі ў касцёле паміж вернікамі, але і ў сем'ях, паміж суседзямі і проста паміж незнаёмымі людзьмі на вуліцы.

Гэта вялікае шчасце – быць добрым, несці дабро людзям і адчуваць яго ў адносінах да сябе. Колькі дзіцячых тварыкаў засвяцілася б радасцю! Колькі высахла б слёз на вачах пакінутых і абязддоленых бацькоў і пажылых людзей!

… А касцёл рыхтаваўся да службы. Яркае святло люстраў азарала святыню, запалалі свечкі. Празвінеў звон, заграў арган. З малітоўнай песняй пачалася імша.

Праз імшу, праз шчырае абвяшчэнне Божага Слова, праз мудрыя казанні святароў чалавек мацней адчувае Божую прысутнасць, сваё яднанне з ім. Толькі ў храме ўся чалавечая істота поўніцца дабрынёй і сардэчнасцю, верай і надзеяй.

Міласэрны Божа, праз твой дазвол няхай гэта іскрынка дабрыні і надзеі аб'ядная людзей у сваёй веры і любові да Цябе, у сваім жаданні міру і спакою на зямлі, у жаданні быць шчаслівымі.

**Аляксандра ЗМІТРУКЕВІЧ,**
**жыхарка в. Прэціма.**

# Кому предстоит уплачивать сбор на финансирование госрасходов?

**Декрет №3 Президента Республики Беларусь “О предупреждении социального иждивенчества” вызвал большой резонанс в обществе, равно как и множество вопросов – частных и не только. На некоторые из них отвечает заместитель начальника инспекции Министерства по налогам и сборам по Щучинскому району, начальник отдела налогообложения юридических и физических лиц Н.А. Зданович.**

**-- На кого распространяется обязанность по ежегодной уплате сбора на финансирование госрасходов?**

-- Плательщиками сбора на финансирование государственных расходов признаются трудоспособные граждане Беларуси, иностранные граждане и лица без гражданства, получившие разрешение на постоянное проживание в республике, в случае их неучастия в финансировании государственных расходов или участия в таком финансировании менее 183 календарных дней в календарном году.

**-- Если человек проживает в сельской местности, где нет подходящей работы, освобождается ли он от уплаты сбора на финансирование государственных расходов?**

-- В Декрете учтены различные варианты занятости граждан. Периодами участия в финансировании государственных расходов считаются периоды осуществления предпринимательской деятельности в качестве индивидуального предпринимателя; выполнения работ по гражданско-правовым договорам; осуществления ремесленной деятельности; а также периоды, в течение которых гражданин, зарегистрированный по месту жительства в сельском населенном пункте, поселке городского типа, вел личное подсобное хозяйство. Факт и период ведения личного подсобного хозяйства гражданином, которому (членам семьи которого) для этих целей предоставлен земельный участок, подтверждаются сельским (поселковым) исполнительным и распорядительным органом.

**-- В каких случаях сумма сбора уменьшается?**

-- В соответствии с Декретом, гражданин обязан заплатить в бюджет сбор на финансирование госрасходов за соответствующий год в сумме 20 базовых величин, исходя из размера базовой величины, установленной на 1 января налогового периода.

